ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Віцебскі пралетары

ЗДЗЕННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, „ рэдактара 1-75, „ сакрат. і к-ры . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў . . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь": Для рабочых, служачых і калгасьнікаў. . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . . . 1 „ 26 „

Плата за абвесткі: За радок жытку . . . . . 30 кап. Для іншатародніх . . . . . 40 „ Пры шматразовым друкаванні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

№ 166 | Серада, 29 ліпеня 1931 г. | № 166

30 ліпеня, а 18 гадз., у Палацу працы, пакой № 11 склікаецца ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ

На абвестцы дню:

1. Даклад аб становішчы камунальнай гаспадаркі гораду.

2. Даклад мандатнай камісіі.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў гарсавету абавязкова. Павінен таксама зьявіцца актыў гарсавету, вольны ў гэты час ад працы на вытворчасьці.

Я пустымі размовамі, а баявой работай трэба зьнішчаць ураўнілаўку—

ГАЛОЎНАГА ВІНОЎНІКА ЦЯКУЧАСЬЦІ РАБСІЛЫ

Няма „аб'ектыўных" прычын. Пасьпяховае выкананьне пляну фанэрнага заводу—залежыць толькі ад ініцыятывы трохкутніка

Трэба арганізаваць такую сыстэму тарыфаў, якая-б улічвала розьніцу паміж працай кваліфікаванай і некваліфікаванай, паміж працай цяжкой і працай лёгкай" (Сталін).

ПРАЦЬ УРАЎНІЛАЎКІ—ЗА ПРАГРЭСЫЎНА-ЗЬДЗЕЛЬНУЮ АПЛАТУ ПРАЦЫ

Велізарныя гіганцкі рост гаспадаркі стварае ў краіне новыя ўмовы і новыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

І з важнейшых задач—больш прагрэсыўна-зьдзельнай аплаты працы, на якую ўказаў Сталін шмат зьвярнуў сваёй апошняй прамове, ніводзін іншай краіне няма бесклясовасьць і Прамысловасьць і гаспадарка галіны народнае гаспадаркі ствараюць вялікі недахоп у кваліфікаванай сіле, асабліва ў кваліфікаваных кадрах. Між тым на многіх прадпрыемствах ня толькі створана такіх умоў, пры якіх рабочы быў-бы зацікаўлены павышэньні сваёй кваліфікацыі. Не было нават створана ўмоў для заахвочваючых працяглае і стажэньне рабочага на данным прадпрыемстве. Гэта выклікае цякучасьць рабочай сілы, „перабежкі" з заводу на завод, нават з аднэй галіны вытворчасьці ў другую. На Віцебскім аўтамабільным заводзе імя Сталінскага і Леніна ў выніку адсутнасьці ўмоў для ўранілаўку ў заробку большая частка кваліфікаваных вальшчыкаў зарабляў менш, чым некваліфікаваныя рабочы. Падобныя факты маюць месца і ва ўмовах віцебскай гаспадаркі, дзе недахоп вялікай колькасьці кваліфікаванай вялізнай цякучасьць рабочай сілы.

Ня гледзячы на тое, што ў нашым горадзе ёсьць шмат прадпрыемстваў, якія даюць вялікую перавыкананасьць прамфінпляну, зьдзельшчыны прагрэсыўнай, прэміяльнай аплаты працы. На металюргічным заводзе імя Дзяржынскага амальгамацыя цынца чэрвеня панавала ураўнілаўка —абязьлічаная аплата працы. У канцы месяцы толькі распарадзілася перавыкананасьць рабочых асноўных цэхаў і забясьпечваную зьдзельшчыну прэміі пачалі налічвацца ня кожны месяц, але кожныя дзесяць дзён. Гэта новаўвядзеньне таксама дало добрыя вынікі. На Сулінскім металюргічным заводзе распрацавалі сыстэму, якая дае рабочы аднаго разраду, які работаючы па рознаму, большае розную аплату працы. Кожную работу разьбілі на апэрацыі, устанавілі норму часу для розных апэрацый і г. д. У выніку агульная выпрацоўка павялічылася і разам з тым павялічылася і зарплата лепшых рабочых. Розьніца ў заробку аднолькавых спэцыяльнасьцяй хістаецца ад 5 да 7 р. Кожны рабочы, прыходзячы на работу, ведае свой заробак за папярэднюю зьмену (вывешваецца табэля). Усё гэта дае вялікі штуршок к падвышэньню прадукцыйнасьці працы.

На Рыкаўскім металюргічным заводзе ў выніку зьмены сыстэмы аплаты працы каталей, прадукцыйнасць іх працы перавысіла норму на 43 проц. Гэта рэкордная лічба для ўсіх нашых металюргічных заводаў. Адначасова павялічыўся і сярэдні дзённы заробак каталя. Да ўвядзеньня прагрэсыўнай зьдзельшчыны ён складаў 3 р. 42 к., а зараз 4 р. 90 к. Сыстэма расцэнак пабудавана так, што чым вышэй норма выпрацоўкі, тым даражэй яны расцэньваюцца.

Ліквідацыя цякучасьці, павялічэньне прадукцыйнасьці працы і імкненьне рабочых падвышаць сваю кваліфікацыю—такавы важнейшыя вынікі такой сыстэмы расцэнак.

Старая сыстэма аплаты павінна быць рашуча перагледжана і заменена прагрэсыўнай зьдзельнай, адказваючай новым умовам гаспадарчага будаўніцтва.

Трэба памятаць, што гэта ня «вузкая практычная справа», а вялікай важнасьці палітычнае пытаньне. Недарма т. Сталін з усёй рэзкасьцю падкрэсьліваў: «хто будуе зараз тарыфную сетку» «на прынцыпах» ураўнілаўкі, бяз уліку розьніцы паміж працай кваліфікаванай і працай некваліфікаванай, той парывае з марксызмам, той парывае з ленінізмам».

„Левая" па форме, а па сутнасьці шкодная і рэакцыйная „ураўнілаўка" павінна бязьлітасна выганяцца з практыкі работы нашай прамысловасьці.

Каб пасьпяхова рухацца наперад, фанэрны завод павінен узяць бальшавіцкія тэмпы

Пастанова прэзыдыуму віцебскага гарсавету па дакладу дырэктара фанэрнага заводу аб дзейнасьці заводу за першае паўгодзьдзе 1931 г.

Ня гледзячы на поўную рэальнасьць плянавага заданьня, забясьпячэньне сыравінай, наяўнасьць абсталяваньня ў адпаведнасьці з плянам і іншых спрыяючых умоў, у выкананьні прамфінпляну па заводу маецца шэраг буйнейшых прарываў. Плянавае заданьне за 1929—30 г. выканана на **70,7 проц.**, за асобы квартал на 51,3, за першы квартал на 82,1, за другі квартал на 69,8, а ўсяго **за першае паўгодзьдзе на 75,3 проц.**

Заводакіраўніцтва ня ўлічыла ўсей адказнасьці працы заводу, як экспортнага і плян па выпрацоўцы экспортнай фанэры выканан за першы квартал усяго толькі на **48,4 проц.**, а за другі квартал на **42,2.**

З прычыны запушчанасьці і неналаджанасьці работы па вядзеньні вучоту і справаздачнасьці, **завод на 7 м месяцы працы ў 1931 г. ня ведае ясных паказальнікаў хаця б за студзень месяц,** што зьяўляецца зусім недапушчальным і сьведчыць аб тым, што завод працуе ўсьляпую, аб маючыхся прарывах, асабліва па якасных паказчыках ня ведае і для ліквідацыі прарыву ніякія меры сваечасова ня прымаюцца, а грамадзкасьць вакол хваробных момантаў працы заводу не мабілізуецца.

Галоўнымі прычынамі стварыўшагася глыбокага прарыву ў працы заводу зьяўляюцца: 1) зусім нездавальняючая арганізацыя і кіраўніцтва вытворчасьцю, нездавальняючая расстаноўка і скарыстаньне рабочай сілы, 2) пераход на бесьперапынку ня быў сваячасова падрыхтаваны і ў працэсе працы дагэтуль кіраўніцтва ня здолела правільна арганізаваць працу заводу, у выніку чаго «абязьлічка» зьяўляецца кіруючым фактарам на вытворчасьці. Абсталяваньне працуе ўвесь час з вялікімі перабоямі і простоямі з прычыны недабраякаснага рамонту, недастатковага нагляду, несваечасовай падачы сыравіны і няўвязкі, якая існуе паміж паасобнымі цэхамі, 3) рацыяналізатарскія мерапрыемствы і рабочыя прапановы не ажыцьцяўляюцца. Няма належнага кіраўніцтва і зусім адсутнічае вучот, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не вядзецца нават колькаснага ўліку працы ўдарнікаў, 4) культмасавая і прафсаюзная праца сярод рабочых зусім адсутнічае, 5) з прычыны адсутнасьці кваліфікаванага тэхнічнага нэрсаналу ўвесь час наглядаецца ваганьне і тэхнічная бездапаможнасьць. Кіраўніцтва працай заводу з боку трэсту лесбел не адчуваецца, 6) дрэнна пастаўлена плянаваньне вытворчасьці. Першы квартал завод работаў без зацьверджанага пляну (плян зацьверджан у сакавіку), 7) прэзыдыум гарсавету з свайго боку адзначае, што **да гэтага часу фанэрнай прамысловасьці з боку гарсавету ня было ўдзелена дастатковай увагі,** як экспортнай галіне прамысловасьці.

У мэтах неадкладнага стварэньня пералому ў працы заводу і забясьпячэньня выкананьня экспортных плянаў, прэзыдыум гарсавету пастанаўляе:

Прапанаваць заводакіраўніцтву, разам з трыкутнікам, неадкладна перабудаваць сваю працу ў бок забясьпячэньня выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Стаць сапраўды на чале сацспаборніцтва і ўдарніцтва, усяляка падтрымліваючы і накіроўваючы энтузіязм мас на лепшую арганізацыю вытворчасьці, шырока разгарнуўшы крытыку і самакрытыку, прымаючы сапраўдныя захады да ўкараненьня новых сацыялістычных мэтадаў працы (зьменна-сустрэчныя пляны, пляна-апэрацыйныя брыгады, гаспадарча разьліковыя брыгады, брыгады па якасьці і г. д.), выяўляючы лжэўдарнікаў, дамагаючыся канкрэтнасьці абавязкаў па сацспаборніцтву і ўдарніцтву і правяраючы выкананьне гэтых абавязкаў.

Для ліквідацыі прарываў абвясьціць па заводу месячнік штурму. Заволакіраўніцтву распрацаваць канкрэтны плян і давесьці апошні да кожнага рабочага, мабілізуючы ўсю грамадзкасьць на пасьпяховае правядзеньне месячніка. Даручыць рэдакцыі газэты **«Віцебскі Пралетары»** на працягу месячніка арганізаваць пэрыядычныя выданьні выязной газэты на заводзе і аказаць дапамогу завадзкому друку ў барацьбе за зьнішчэньне недахопаў у працы заводу. Прымацаваць да заводу намесьніка старшыні гарсавету **Камень штэйна.** Прамысловай сэкцыі прымацаваць да заводу члена сэкцыі. Адзначаючы, што **прамфінплян на трэці квартал з унесенымі фанэратрэстам зьменамі да гэтага часу на вытворчасьці сярод рабочых не абгаворваўся** і дэталёва не распрацоўваўся, прапанаваць заводакіраўніцтву ў дэкадны тэрмін распрацаваць плян на трэці квартал, пасьля чаго неадкладна з улікам сустрэчных прапаноў давесьці яго да кожнага рабочага.

Заводакіраўніцтву праводзіць у поўнай меры адзінаначальне на вытворчасьці, устанавіўшы правы і абавязкі і нэрсанальную адказнасьць адміністрацыйна-тэхнічнага нэрсаналу па выконваемай ім працы.

У двухдэкадны тэрмін распрацаваць і ажыцьцявіць канкрэтныя мерапрыемствы па зьнішчэньні прастояў абсталяваньня, даводзячы іх да мінімуму. У месячны тэрмін скончыць працу па паспартызацыі абсталяваньня.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу на правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыёмстваў, арганізаваўшы бюро па рацыяналізацыі вытворчасьці, у двухдэкадны тэрмін разглядзець усе паступіўшыя да гэтага часу рабочыя прапановы, устанавіўшы канкрэтныя тэрміны ажыцьцяўленьня іх і ў далейшым забясьпечыць выяўленьне, хутка ажыцьцяўляць і прэміяваць каштоўныя рабочыя прапановы і вынаходствы.

У месячны тэрмін пераглядзець усю сыстэму зарплаты па заводу, устанавіўшы такую сыстэму аплаты працы, якая стымулявала-б узрост прадукцыйнасьці працы, падвышэньне кваліфікацыі, цалком зьнішчыць падзённую аплату, бяручы напрамак устанаўленьня індывідуальнай зьдзельшчыны, замест існуючай групавой. Наладзіць працу ТНБ на вытворчасьці,

Заводакіраўніцтву разам з трыкутнікам павесьці жорсткую барацьбу з усялякімі праявамі рвацтва, прагульшчыкамі, лятунамі і іншымі парушыцелямі працдысцыпліны.

У мэтах павялічэньня выхаду экспорту і большай эфэктыўнасьці працы абсталяваньня ўстанавіць сталы нагляд за належнай сартыроўкай, раскрыжоўкай і хаваньнем сыравіны

Прапанаваць заводакіраўніцтву замацаваць рабочых за адпаведнымі варштатамі, зьнішчыўшы «абязьлічку» у абслугоўваньні абсталяваньня, распрацаваць мерапрыемствы па аўладаньні рабочымі тэхнікай вытворчасьці, праверыць скарыстаньне і растаноўку рабочай сілы. Прасіць фанэратрэст накіраваць на завод неабходную колькасьць кваліфікаванага адміністрацыйна-тэхнічнага нэрсаналу, а заводакіраўніцтву забясьпечыць іх адпаведнымі бытавымі ўмовамі. На працягу 10 дзён распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні арганізацыі вытворчасьці.

Прасіць гарпрафсавет праверыць кіраўніцтва і становішча сацспаборніцтва і ўдарніцтва на вытворчасьці.

Укамплектаваць штат плянава-эканамічным працаўнікам, зьвярнуўшы ўвагу на паляпшэньне якасьці плянаваньня. Ліквідаваць запушчанасьць справаздачнасьці не пазьней 1-га жніўня, к якому тэрміну павінна быць скончана складаньне балянсу за першае паўгодзьдзе.

У месячны тэрмін поўнасьцю ажыцьцявіць укараненьне гаспадарчага разрахунку на ўсе зьвенні гаспадарчай дзейнасьці заводу, мабілізаваўшы грамадзкасьць на арганізацыю гаспадарча-разрахункавых брыгад на вытворчасьці.

Заводакіраўніцтву тэрмінова даўмовіцца з начальнікам 6 га вуч. МВБ чыгункі аб далейшым расьпісаньні руху цягнікоў да заводу.

У мэтах зьнішчэньня цякучасьці рабсілы, побач з мерапрыемствам па лепшай арганізацыі сыстэмы зарплаты і падвышэньні кваліфікацыі, заводакіраўніцтву зьвярнуць увагу на палепшаньне культурна - бытавых умоў на вытворчасьці, для чаго 1) абавязаць будкантору скончыць будаўніцтва пачатых двух дамоў не пазьней 1 верасьня 1931 году, 2) заводакіраўніцтву з 1-га кастрычніка адвесьці памяшканьне для дзіцячых ясьляў, а інспэктару ахматмладу адчыніць ясьлі на заводзе з гэтага тэрміну, 3) заводакіраўніцтву цалком скарыстаць у гэтым годзе дадаткова адпушчаныя 132 тыс. руб. на жылбудаўніцтва. Прыняць да ведама заяву дырэктара, што гэта будаўніцтва ў 1931 г. будзе праведзена сіламі заводу гаспадарчым спосабам. Інспэктару працы ў дэкадны тэрмін накіраваць на завод тэхніка - будаўніка, 4) заводакіраўніцтву неадкладна адрамантаваць памяшканьне сталовай, 5) лічыць недапушчальным нездавальняючае абслугоўваньне сталовай і зачыненага разьмеркавацеля з боку ЦРК (позьняя дастаўка хлеба і прадуктаў, адсутнасьць інвэнтара ў сталовай, аднастойнасьць харчаваньня і г. д.). Прапанаваць ЦРК неадкладна праверыць і наладзіць лепшае абслугоўваньне сталовай і зачыненага разьмеркавацеля.

Лічачы недапушчальным, што прапановы шэрагу камісій, абсьледаваўшых працу завода, застаюцца нявыкананымі (камісіі Наркомпрацы і ЦСПСБ, камісіі НК РСІ і інш.) прапанаваць заводакіраўніцтву праверыць выкананьне маючыхся пастаноў, а таксама арганізаваць сталы кантроль выкананьня дадзеных дырэктыў, асабліва па выкананьні плянў экспорту.

Інспэктару працы ў дэкадны тэрмін праверыць становішча аховы працы на заводзе і выкананьне пастаноў камісіі Наркампрацы.

Даручыць старастату членаў гарсавету на заводзе нагляд за выкананьнем пастановы прэзыдыуму. Старастату стаць застрэльшчыкам уздыму новай хвалі сацспаборніцтва і ўдарніцтва і забясьпечыць 100-проц. удзел членаў і актывістых гарсавету ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве.

„Ураўнілаўка" стварае цяжкасьць і павялічвае брак

Вязальны цэх панчошнай фабрыкі Імя Клары Цэткін адыгрывае дамініруючую ролю ў выкананьні вытворчай програмы ўсёй фабрыкі. За апошні час гэты цэх сыстэматычна ня выконвае прамфінплян. З-за адсутнасьці голак і недахопу мэханікаў часта ствараюцца прастоі варштатаў. Каб ня спыніць работу цэху, прыходзіцца вынімаць голкі з адных машын і ўстаўляць іх у другія. Значна павялічылася, асабліва за апошні час, цякучасьць рабочай сілы. На зьмену ў сярэднім ня выходзіць кожны раз 10—15 чал. Каб не дапускаць простоі варштатаў на працягу цэлай зьмены, адміністрацыя фабрыкі месца адсутнічаючых рабочых запаўняе зусім слаба падрыхтаванымі вучнямі, якія з працай не спраўляюцца, робяць брак і г. д. Асабліва недахоп рабсілы адчуваецца ў працы начных зьмен.

У чым хаваецца аснаўная прычына цякучасьці? А галоўным чынам у тым, што **не ліквідавана** ўраўнілаўка **ў заробку.** У той час, калі кваліфікаваная работніца атрымлівае ў месяц **50—65 руб.**, чорнарабочыя-чысьцільшчыкі машын атрымліваюць **100—110 руб.** Існуючая «абязьлічка» з свайго боку таксама дае дрэнныя вынікі працы цэху. Брак за апошнюю дэкаду павялічыўся. Каля 20 машын з-за нядбайнай і безадказнай працы работніц выбылі са строю і знаходзяцца „у доўгім рамонце", бо не хапае частак і мэханікаў.

Ня лепш абстаіць справа і ў іншых цэхах. З-за несваечасовага забясьпячэньня ласьцічнага цэху матар'ялам для вязальна-насочных машын ствараюцца часта прастоі апошніх. Часта ласьцік падаецца бракаваным, з-за чаго атрымліваецца вялікі процант штопкі і браку.

Існуючая бясплянавасьць штучна стварае ўнутрыфабрычную неразьбярыху, якая зрывае працу паасобных цэхаў. Так, красільна-апрэтурны цэх скарыстоўвае фабрыкат, які прызначан не па пляну, чаму ў швэйна-кецельным цэху ствараюцца вялікія запасы. Ня гледзячы на тое, што цэхі пераведзены на гаспадарчы разрахунак, вынікаў працы няма, бясплянавасьць і безадказнасьць не даюць магчымасьці весьці працу, кантралюючы рублём.

Пара ўжо работаць па-новаму. Трэба рашуча паставіць пытаньне аб ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі, якія на фабрыцы зьяўляюцца вялікім злом у выкананьні прамфінпляну. Калі трыкутнік фабрыкі возьмецца за гэтую справу па-баявому і дасьць кожнаму вучастку работу, кожнаму варштату гаспадара, які-б адказваў матар'яльна за становішча варштата, інструманта, за якасьць работы, тады толькі можна мець добрыя вынікі. Ня ўзброіўшыся гаспадарчым разрахункам, не ліквідаваўшы цалком ужо аджыўшыя даўно ўраўнілаўку і абязьлічку, не мабілізаваўшы актыўнасьць ударнікаў,—фабрыка ня здолее выйсьці з ганебнага прарыву і выканаць с в а ё плянавае заданьне.

І. Эйдлін.

Без гаспадарчага вока—ў палоне бесплянавасьці і разгільдзяйства

Слова за пракуратурай і РСІ

На старонках «Віцебскага Пралетарыя» мы пісалі, што кіраўніцтва на **новай панчошнай фабрыцы** адсутнічае і сапраўды адсутнасьць кіраўніцтва, наогул, і тэхкіраўніцтва, у прыватнасьці, дае сябе значна адчуваць. Галоўны інжынэр **Рабчык** зьяўляецца на фабрыку ня больш 3 х разоў у тыдзень, а прыехаўшы замест сапраўднага кіраўніцтва і дапамогі тэхнічным работнікам зрывае працу апошніх. Ён бяз ведама тэхніка ўзгадняе пытаньне з будуючай арганізацыяй, ня прытрымліваючыся чарцяжоў, з-за чаго праца часта прыпыняецца і перарабляецца зноў. Пры такой пастаноўцы працы тэхнікі ня ведаюць што ім рабіць і завальваюць дырэктара заявамі аб звальненьні іх з працы таму, што ім няма чаго рабіць. Дырэктар, атрымаўшы заявы, ніякіх мэр ня прымае і **усе іх хавае ў сябе ў стале,** дзе яны ляжаць увесь час без рэагаваньня. Бязумоўна, што ад такой працы нельга чакаць добрых вынікаў. Ствараюцца склокі, нездавальненьні і замест ударнай працы—ударнае будаўніцтва сканчаецца чарапашымі тэмпамі. Сноп.

Амаль што год мінула з таго часу, як скончана фабрычная труба, у якой патрабуецца зрабіць унутры хутроўку агнятрывалай цэглай, якая на пабудове маецца даўно і ў дастатковай колькасьці. Адміністрацыя фабрыкі «забыла», што там неабходна вытвараць работу і, ня скончыўшы сваёй працы, меўшыхся ў сваім распараджэньні каменшчыкаў перадала будаб'яднаньню і толькі зараз успомніла, што ім патрэбны каменшчыкі, каб зрабіць хутроўку ўнутры трубы, якая займе шмат часу, бо трэба выкласьці 12 мэтраў увышыню.

Адначасова трэба адзначыць, што «гаспадарнікі» панчошнай фабрыкі ніколькі ня цікавяцца эканоміяй сродкаў. Аб гэтым ужо неаднаразова друк адзначаў. Факты працягваюць мець месца. Так, напрыклад, за ўкатку трансфарматара ў будку на адлегласьці 20 мэтраў уплацілі 100 руб. На гэтай працы было занята чатыры рабочых дзьве з паловай гадзіны.

Безадказная і нядбайная праца працягваецца на новай панчошна-трыкатажнай фабрыцы—такі вывад трэба зрабіць і на гэты раз. Мы ўжо неаднаразова прывадзілі шмат прыкладаў, паказваючых на адсутнасьць гаспадарчага вока, плянавасьці і цьвёрдага кіраўніцтва. Сыгналы друку застаюцца не пачутымі. Пара пакласьці канец безадказнай працы і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых.

Рабочыя.

Зьняць пагрозу зрыву забесьпячэньня вучняў адзеньнем

За зрыў усеагульнага пачатковага навучаньня ў мінулым годзе, за нядбайныя адносіны да забесьпячэньня вучняў гатовым аддзеньнем адпаведных разьмераў, работнікі Белшвэй аб'яднаньня ўжо атрымалі па заслугах, але гэта не паслужыла для іх урокам. Памылкі мінулага зноў па чынаюць паўтарацца на швэйных фабрыках «Сьцяг індустрыялізацыі» і «Прафінтэрн».

Фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» ігнаруе плянавае заданьне фабрыкі «Прафінтэрн», зацьверджанае Белшвэйаб'яднаньнем, у якім яскрава паказана, што закройны цэх фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» павінен дастаўляць паўфабрыкаты фабрыцы «Прафінтэрн» 34 — 42 разьмераў. Прысланая партыя паўфабрыкату аказалася 32-га разьмеру, які зусім не прадугледжан плянам, у выніку чаго фабрыка «Прафінтэрн» ня мае магчымасьці грузіць па плянавых нарадах паліто для школьнікаў 42-га разьмеру і ня ведае куды накіроўваць 32 разьмер. Ствараецца пагроза зрыву забесьпячэньня вучняў адзеньнем, а на складах ствараюцца залежы мёртвага капіталу на дзесяткі тысяч руб.—паліто малых разьмераў.

Пракуратура павінна расьсьледаваць, хто з гаспадарнікаў фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» стварае зрыў забесьпячэньня фабрыкі «Прафінтэрн» плянавым асартымэнтам прадукцыі і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

М. Левін.

Раўнілаўкі ў нас няма — ўсе працуюць зьдзельна"

прамове т. Сталіна работнікі **ямецкай фабрыні** яшчэ даць ня ведаюць. На рабочым не стаяла пытаньне аб ычнай рэалізацыі прамовы, білізацыі мас на барацьбу амфінплян і гэта ў той калі лічбы выкананьня прамяну за першую дэкаду аюць 94,6 проц., а за друголькі—81,22 проц. «Ураўкі ў нас няма, усе пра**ць зьдзельна»**—адказваюць нікі фабрыкі. Калі-ж на е добра прыглядзецца, дык відавочна, што ўраўнілаўць. Насьцільшчыкі будаўа лямцу па характару сваботы не залежаць ад казных машын, а зарплату атіваюць ад вырабу катальных ын. Маецца значная цякуць рабсілы, але прычыны ня наюцца. Мерай барацьбы супроць цякучасьці зьяўляецца толькі выключэньне з саюзу і ўжываньне адміністрацыйных мер. Ніякая работа з новымі рабочымі не вядзецца. Слабы ахоп рабочых ударніцтвам, штодзённай працы сярод ударнікаў не вядзецца, нават адсутнічае вучот эфэктыўнасьці працы ўдарнікаў. З паданых 5 каштоўных прапаноў па рацыяналізацыі выкананы тры.

Фабрыка мае ўсе магчымасьці пасьпяхова выканаць і перавыканаць плянавае заданьне. Лічбы выкананьня прамфінпляну першага паўгодзьдзя гэта даказалі. Неабходна толькі больш мабілізаваць увагу рабочых вакол зьнішчэньня ўсіх недахопаў і ў першую чаргу зьнішчыць ураўнілаўку, якая яшчэ працягвае існаваць.

Шыф.

«Мяне Менск прыслаў толькі кіраваць»

рыцягнуць Валасянага да суровай адказнасьці.

вагарамонтнай майстэрні ектр» існуе злачынная безгаспасьць, якую стварае сваёй безкінай працай брыгадзір **Валасяны.** ада майстэрні складаецца ўсяго х чалавек: майстра і вучня. адзір Валасяны на заўвагу ра, чаму ён не працуе, адказвае: **е Менск прыслаў толькі ваць».** 19-га ліпеня ён заявіў ым, што ўяжджае ў Менск для ятленьня пытаньня—ці павінен ботаць ля варштату разам з адай і абяцаў хутка зьвярнуцца. ла пяць дзён, на працягу якіх тэрня не работала. Рабочыя кожны раз падыходзілі да майстэрні, але заўсёды атрымлівалі адзін адказ ад жонкі Валасянага: **„мужа няма. Ён яшчэ ня прыехаў, а калі прыедзе, ня ведаю і ён даслаў свайго прыезду загадаў мне ня пушчаць вас у майстэрню».**

Гэты брыдкі факт патрабуе тэрміновага ўмяшацельства РСІ і пракуратуры ў гэтую справу. Мы лічым, што з-за нядбайнай, безадказнай працы брыгадзіра Валасянага трэба з працы зьняць і прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Рабочы.

Абавязкі па калдагавору ня выконваюцца

Пры перазаключэньні калдагавору на фабрыцы **гнутай мэблі** была абрана брыгада, праводзілі гутаркі па цэхах, зьбіралі прапановы рабочых, абгаварвалі некалькі разоў гэтае пытаньне на агульных сходах, на паседжаньнях фабкому, усе бралі на сябе канкрэтныя абавязкі, але далей сходаў справа ня рушылася. Вылучаная агульным сходам брыгада па праверцы калдагавору высьветліла, што аніводзін пункт абавязкаў ня выкананы.

Са дня заключэньня калдагавора па 1-е чэрвеня было 17 прагулаў па няўважлівых прычынах, 9 спазьненьняў на работу, 6 вымоў за недабраякасны выпуск прадукцыі, 11 вымоў за адказ ад работы, 2 крадзёжы фабрычнай маёмасьці.

Фабком не арганізоўваў масы вакол выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, не кіраваў сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, з прычыны чаго меўшыя ся чатыры брыгады распаліся і з двух камун адна распалася, а другая—напярэдадні гэтага. Фабком не дапамагаў перавесьці цэхі на гаспадарчы разрахунак і на сёньняшні дзень цэхі яшчэ не **перавэдзены.** Перагляд норм выпрацоўкі дагэтуль яшчэ не ажыцьцяўлён. **Аплата працы адпаведна кваліфікацыі рабочых яшчэ не праводзіцца.**

Аховы працы не адчуваецца. Аптэчкі з медыкамэнтамі адсутнічаюць, гатаванай вады ў цэхах няма, а таксама няма і шафаў для хаваньня харчэй, цэхі дрэнна прыбіраюцца. Замест жыроў выносчыкам з сушылак адміністрацыя выдае прастаквашу і то не заўсёды, у рукамойніках зачастую на бывае вады. Калдагавор не даведзен да рабочых і ніхто ня ведае аб яго лёсе. Броні, замест 9 проц. агульнага ліку рабочых на заводзе, маецца толькі 1 проц. Рабочыя прапановы не ажыцьцяўляюцца.

Адпаведныя арганізацыі павінны належным чынам узьдзейнічаць на тых, хто ня выконвае ўзятых на сябе па калдагавору абавязкаў.

Рабкораўская брыгада:

Драгуноў, Круц.

НА ПЛЕНУМЕ ГАРКОМУ КП(б)Б

Новая абстаноука патрабуе новых форм кіраўніцтва вытворчасьцю

Дзелавыя рашэньні пленуму па дзелавому праводзіць у жыцьцё

З дакладу сэкратара гаркому тав. Судакова

26-га ліпеня адбыўся пленум ГК КП(б)Б, разам з партактывам. З дакладам аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні ў жыцьцё пастановы ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб становішчы і рабоце віцебскай арганізацыі выступіў сакратар гаркому **т. Судакоў**, які завастрыў увагу пленуму і партактыву на тым, што віцебская арганізацыя займае другое месца на Беларусі, як арганізацыя, маючая большую колькасьць членаў партыі і рабочую праслойку. Партыйная арганізацыя яшчэ не перабудавала сваю працу пад кутом погляду рашэньняў ЦК і ЦКК КП(б)Б і не павярнулася дастаткова тварам да вытворчасьці, не мабілізавала дастатковай увагі рабочае клясы вакол практычных мерапрыемстваў па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну. Перабудова працы праходзіць вяла, з прычыны чаго маецца вялікі процант невыкананьня прамфінпляну. За 1-е паўгодзьдзе прамфінплян выканан на 86 проц., а за апошнія 20 дзён ліпеня толькі на 73 проц. Гэта сьведчыць, што парткалектывы на мясцох не прыступілі да канкрэтнай працы, не скарыстоўваюць ініцыятыву ўдарнікаў, рабкораў і перадавых рабочых. Былі выпадкі, калі мясцовая газэта, замест мабілізацыі рабкораў вакол практычных мерапрыемстваў, бічавала рабкораў. Намі яшчэ мала праведзена працы сярод інжынэрна-тэхнічнага складу па канкрэтных пытаньнях будаўніцтва. Нарада інжынэрна-тэхнічнага складу сьведчыць аб адсутнасьці актыўнасьці сярод гэтае масы.

Застанаўляючыся на кожнай галіне прамысловасьці паасобку, т. Судакоў кажа, што акулярная фабрыка на сёньняшні дзень мае выпрацаванага прамфінпляну. Трэба пленуму даць канкрэтную ўстаноўку аб перабудове працы акулярнай фабрыкі.

Пытаньне праполачнай кампаніі абстаіць дрэнна. Прадпрыемствы, якія ўзялі шэфства над гаспадаркамі, не мабілізавалі вакол праполачнай кампаніі ўвагу рабочых, з прычыны чаго мы маем у каапгасах ЦРК 5100 тон згубленай гародніны. На сёньняшні дзень каапгасы і калгасы яшчэ не падрыхтаваліся да ўборачнай кампаніі, адсутнічаюць склады. Партыйным калектывам на мясцох трэба зараз-жа паставіць пытаньне ўборачнай кампаніі на рабочых сходах і практычна дапамагчы ўборачнай кампаніі. Востра абстаіць пытаньне з торпараспрацоўкамі. Бюро гаркому вынесла канкрэтную пастанову і мабілізавала частку рабочых на торпаздабываньне. Таксама дрэнна абстаіць справа і з нарыхтоўкай дроў. Бюро гаркому ў гэтым напрамку зьвярнулася да Сураскага і Лёзьненскага раёнаў аб дапамозе ў нарыхтоўцы дроў Віцебску, як пралетарскаму цэнтру. На сёньняшні дзень мы ўжо маем некаторыя вынікі.

Для сваечасовай уборкі і перавозкі гародніны і збожжа, гарком у праэкце рэзалюцыі выносіць канкрэтныя мерапрыемствы па палепшаньні работы транспарту, забясьпечаньні патрэбнай колькасьцю вагонаў, і паравозаў, паказвае сталую лічбу для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Тав. Судакоў завастрае ўвагу пленуму і актыву на пытаньні гаспадарчага разрахунку, бо ў гэтым напрамку віцебскай партарганізацыяй мала зроблена, гаспадарчы разрахунак намі прынят фармальна. Парткалектывам на мясцох трэба зараз-жа паставіць пытаньне гаспадарчага разрахунку і перавесьці ўсю працу прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак. Па сельскай гаспадарцы мы маем вялікія дасягненьні. Намі выкананы кантрольныя лічбы па калектывізацыі, але пытаньне з пераходам на зьдзельшчыну абстаіць дрэнна—ніводзін калгас дагэтуль не пераведзен на зьдзельшчыну. Віцебск, як рабочы асяродак, можа дастаткова дапамагчы калгасам ня толькі Віцебскага раёну, але і суседніх раёнаў, каб зрабіць уплыў на вёску, дапамагчы ў рамонце сельска-гаспадарчых машын і г. д. Па спэцыялізацыі раёнаў намі зроблена вельмі мала. У гэтым напрамку пленум павінен вынесьці канкрэтныя мерапрыемствы. Тав. Судакоў застанаўляецца на пытаньні росту партыйнай арганізацыі, на тым, што калектывы ў гэтым напрамку вельмі мала зрабілі. Трэба зараз-жа на прадпрыемствах арганізаваць курсы і гурткі па падрыхтоўцы рабочых у партыю і штодзённа весьці працу па вярбоўцы рабочых у партыю. У нас ёсьць усе магчымасьці для павялічэньня рабочай праслойкі ў партарганізацыі. Некаторыя калектывы прадпрыемстваў мэханічна падыходзяць да гэтага важнага пытаньня, прымаючы ў партыю, недастаткова абгаварваюць кандыдатуру паступаючага.

Тав. Судакоў спыняецца на момантах маючай месца недысцыплінаванасьці сярод членаў партарганізацыі, якая перайшла ў палітычную бязьдзейнасьць, з прычыны чаго зьмяншаюцца тэмпы працы, атрымліваецца маруднасьць і вяласьць. Па пытаньні беларусізацыі віцебская партыйная арганізацыя яшчэ не ліквідавала, як адзначана ў пастанове ЦК і ЦКК КП(б)Б, «маючагася глыбокага прарыву». Арганізацыя не ўзялася за канкрэтнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі ў пытаньні абслугоўваньня нацменшасьцяй на роднай мове. На сёньняшні дзень яшчэ маюцца моманты заціску самакрытыкі з боку некаторых калектываў. Баязьнь самакрытыкі назіраецца яшчэ амаль на ўсіх прадпрыемствах. Трэба зараз-жа прыступіць да ажыцьцяўленьня пастаноў па разгортваньні крытыкі і самакрытыкі.

Практычнага ажыцьцяўленьня ўсіх мерапрыемстваў і канкрэтнага ажыцьцяўленьня прамовы т. Сталіна і пастановы ЦК і прэзыдыуму ЦКК аб становішчы віцебскай партарганізацыі можна дабіцца тады, калі ўсе калектывы канчаткова павярнуцца тварам да вытворчасьці, саўгасаў і калгасаў, мабілізаваўшы ўвагу рабочае клясы вакол выкананьня задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Спрэчкі па дакладу тав. Судакова

Даклад **т. Судакова** выклікаў ажыўлёныя спрэчкі. Усе выступаўшыя ў спрэчках таварышы, ў асноўным, згаджаліся з праэктам практычных прапаноў для далейшай работы арганізацыі, выходзячы з пастановы ЦК і ЦКК па агляду партыйнай арганізацы

Тав. Закржэўскі. Па яго думцы неабходна пленуму гаркому партыі зьвярнуць больш увагі на восенна-зімовыя перавозкі, да якіх яшчэ як сьлед ня рыхтуюцца. Віцебскі вузел павінен адрамантаваць 13 паравозаў, але тэмпы работы і асабліва такарнага цэху зусім нездавальняючыя. У такарным цэху няма сталых працаўнікоў. Многа паравозаў маецца хворых і для накіраваньня іх у капітальны і сярэдні рамонт неабходных мер ня прымаецца. Далей т. Закржэўскі застанавіўся на пытаньні рабочага забясьпечаньня на чыгунцы, дзе ТПО сваю працу тварам да прамфінпляну яшчэ не пераключыла.

Тав Гонікман і інш. Праэкт канкрэтных прапаноў для далейшай работы арганізацыі, паданы пленуму, кажа аб тым, што гарком становіцца на шлях павароту тварам да вытворчасьці. Партактыў і ўся партыйная арганізацыя павінны ўсяляка дапамагчы гаркому партыі ў яго рабоце. Па думцы т. Гонікмана, праэкт трэба дапоўніць пытаньнямі: ўдзяленьне большай увагі якасьці прадукцыі, рабоце гарпрафсавету, рэдакцыі „Віцебскі пралетары", рабселькораўскаму руху, сацспаборніцтву і ўдарніцтву і г. д. Далей т. Гонікман кажа аб неабходнасьці прыняцьця ўсіх мер для забесьпячэньня прадпрыемстваў рабочай сілай і палепшаньня бытавых умоў (яслі). Самакрытыка яшчэ не разгорнута і неабходна мабілізаваць усю партыйную арганізацыю на бальшавіцкае яе разгортваньне.

Тав. **Цукерман**. Праэкт зьяўляецца палітычным дакумантам, у складаньні якога ўдзельнічаў партыйны актыў. Праэкт прадугледжвае канкрэтныя мерапрыемствы амаль па кожнай галіне працы. Тав. Цукерман у сваёй прамове асабліва завастрыў увагу на масавай рабоце гарсавету, становішча якой на сёньняшні дзень зьяўляецца пагражальным, бо зрываюцца пленумы сэкцый. Многія партыйцы члены гарсавету ня прымаюць удзелу ў рабоце гарсавету. Партыйныя арганізацыі на мясцох у сваёй большасьці ня кіруюць дэпутацкімі групамі. Сацсумяшчэньне ў жыцьцё не праводзіцца. ФЗМК не выдучаюць таварышоў.

Тав. **Росін** («Сьцяг індустрыялізацыі"). На фабрыцы абязьлічка. Няма адказных за працу. Партыйныя арганізацыі фабрыкі недастатковую ўвагу зварочваюць на якасьць прадукцыі. Гуркі па падрыхтоўцы ў партсыю на фабрыцы адсутнічаюць. ЗРК працуе дрэнна. Клюб і сад фабрыкі бязьдзейнічаюць. Партыйная арганізацыя фабрыкі павінна павярнуцца тварам да вытворчасьці.

Тав. **Бароўскі**. Прамфінплян на цагельных заводах ня выконваецца, што пагражае зрывам некаторых строек. Цякучасьць рабочай сілы на заводах неймаверная. Партыйнай арганізацыі неабходна больш увагі зьвярнуць на цагельныя заводы.

Тав. **Хрол**. Зараз неабходна на прадпрыемствах сярод рабочых праводзіць дыфэрэнцыяльную работу са старымі і новымі рабочымі ў паасобку. Неабходна нашым прадпрыемствам дабіцца сталага вучоту рабочых ударнікаў.

Дрэнна тое, што многія камуністыя ня чытаюць газэты. Тав. Хрол прывёў прыклад, калі на чыгунцы сабралася на гурток па прапрацоўцы прамовы т. Сталіна 40 чал., з якіх толькі некаторыя чыталі прамову тав. Сталіна. Партвучоба у сваёй большасьці не прыстасавана да ўмоў вытворчасьці. Неабходна зараз пачаць падрыхтоўку да восенна-зімовай вучобы.

Тав. **Зялёны**. Работа ЦРК і ЗРК пастаўлена дрэнна. Многія прадпрыемствы ў дэкаднік агляду перабудовы работы каапэрацыі ня ўключыліся. Парткалектывы ячэйкі і ФЗМК на мясцох у сваёй большасьці рабоце ЗРК не дапамагаюць. Неабходна дабіцца правільнай і лепшай растаноўкі людзей.

Тав. **Левін**. Партыйныя ячэйкі ў сваёй большасьці ў рабоце камсамольскім ячэйкам не дапамагаюць. Партпрымацаваныя ня ўсюды маюцца. Некаторыя партпрымацаваныя выступаюць супроць 100% ахопу рабочай моладзі ў камсамол (Іваноўскі—фабрыка «Дзьвіна»). У кіраўніцтве некаторых партыйных ячэек камсамольскімі маюцца яўныя скажэньні. Бюро партячэйкі лесзаводу, заслухаўшы даклад аб рабоце камсамольскай ячэйкі, пастанавіла зьняць сэкратара і тут-жа вылучыла другога, а другому даручыла падрыхтаваць трэцяга (у той час, калі сэкратар ячэйкі павінен абіраца). З боку некаторых арганізацый маецца недаацэнка работы ФЗВ. Рэдакцыя газэты «Віцебскі Пралетары» сваю працу яшчэ не перабудавала.

Тав. **Рубін** расказвае пленуму аб тых мерапрыемствах, якія намеціў гарпрафсавет у сваёй далейшай працы (дыфэрэнцыяцыя работы з рабочымі і рад іншых).

Тав. **Жуковіч**. Ён у сваёй прамове напомніў пленуму аб рашэньні пленуму ЦК КП(б)Б дабіцца ліквідацыі прарыву. Датычачыся работы акулярнай фабрыкі, т. Жуковіч гаворыць аб глыбокім прарыве, маючымся на фабрыцы, калі прамфінплян за першы квартал быў выканан на 75 проц., за другі на 62. На фабрыцы маецца вялікая разьбежка паміж прадукцыйнасьцю працы і зарплатай і замест зьніжэньня сабекаштоўнасьці—павялічэньне. Прагулы на фабрыцы складаюць 3,44 проц. Гэта зьяўляецца вынікам непавароту партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі фабрыкі тварам да вытворчасьці. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты. На ф-цы па сьпісках лічыцца каля 600 ударнікаў, а калі трэба было каго-небудзь прэміяваць, дык прышлося ўдарніка шукаць днём з агнём. Чатыры разы краду партыйны сход на фабрыцы зрываўся. У чым справа, дзе карэньні зла? Справа ў неарганізаванасьці, расхлябанасьці. Унутрызавадзкое плянаваньне пастаўлена вельмі дрэнна. Далей т. Жуковіч застанаўляецца на брыгадах, якія амаль штодзённа бываюць на акулярнай фабрыцы, але нічога канкрэтнага не даюць. Застанаўляючыся на пытаньні камунальнай гаспадаркі і дабрабыту, т. Жуковіч гаворыць аб нездавальняючым становішчы камунальнай гаспадаркі ў горадзе.

Тав. **Іваноў** завастрыў увагу пленуму па падрыхтоўцы да восенна-зімовых перавозак.

Пленум прайшоў дзелавіта і ў асноўным прыняў праэкт прапаноў для далейшых мерапрыемстваў у рабоце віцебскай партыйнай арганізацыі. Былі таксама ўнесены і некаторыя дадаткі. Выработка праэкту да пленуму кажа аб тым, што гарком партыі стаў на шлях канкрэтнага кіраўніцтва, даўшы паказаньні кожнай партячэйцы і прадпрыемству, як трэба працаваць. Неабходна ўсёй партыйнай арганізацыі мабілізавацца на поўнае выкананьне пастаноў пленуму.

Правяраем разгортваньне ўборкі

Сенаўборачная недапушчальна зацягнулася

КАЛГАСЫ: „КАПАЧОВА", „ЧЫРВОНАЙ АРМІІ", „БАРАЦЬБІТ" ПРАВАЮЦЬ ПЛЯНЫ СІЛАСАВАНЬНЯ

ЗМАГАЦЦА ЗА КОЖНЫ ГЭКТАР СЕНА, ЗА КОЖНУЮ ТОНУ СІЛОСУ

За пералом!

Паводле пастановы Калгасцэнтру, уборка сена павінна была быць скончана да 20 ліпеня. З сёньняшняй зводкі відаць, што гэтая пастанова ня выканана. Усяго скошана сенажаці па калгасах 11.354 га, аднаасобнікамі 6.615 га. Значна адстае аднаасобны сэктар, які выканаў толькі 53 проц. пляну.

Праблема сацыялістычнай жывёлагадоўлі, якая патрабуе хуткага вырашэньня, павінна мець моцную кармавую базу. Вось чаму неабходна канцэнтрацыя ўсёй увагі вакол гэтага пытаньня. **«Справа не толькі ў тым, каб скончыць сеназбоpку, але, галоўным чынам, забясьпечыць сябе кормамі на 1932 г.».** Так зусім правільна ставіць пытаньне ў сваёй перадавой ад 25 ліпеня газэта «Зьвязда».

Сілос, які адыгрывае галоўнейшую ролю ў вырашэньні кармавой праблемы, многімі ігнаруецца. Надзвычайна пагражальнае становішча з сіласаваньнем кармоў па Віцебскаму раёну. Досыць сказаць, што плян сіласаваньня на 25-е ліпеня выкананы па калгасах толькі на 10,6 проц., каб адразу ўявіць сабе гэтае становішча.

Шукаць прычын, чаму гэтак стварылася, доўга ня трэба. Толькі апартуністычная недаацэнка сіласаваньня, недаацэнка стварэньня моцнай кармовай базы, **недаацэнка** разьвіцця праблемы жывёлагадоўлі стварылі гэты ганебны прарыў. Сельсаветы сіласаваньню кармоў не надалі належнай увагі, а камсамольскія ячэйкі, якія так горача на сходах галасавалі за сілос, таксама нічога не зрабілі. Гаркамол завальвае ячэйкі дырэктывамі, а справа за апошнюю пяцідзёнку наперад амаль не пасунулася. Тут трэба проста сказаць, што гарадзкі камітэт камсамолу, а разам з ім і камсамольскія ячэйкі, працягваюць сваю недаацэнку сіласаваньня кармоў. Партыйныя ячэйкі ў гэтых адносінах мала чаго зрабілі.

Праводзімы месячнік генэральнай праверкі і самаправеркі разгортваньня ўборкі павінен унесьці карэнны пералом. Зьдзельшчынай трэба забясьпечыць выкананьне плянаў сенаўборкі і сіласаваньня.

Зводка праполкі і ўборкі па 14 сельсаветах Віцгарсавету на 25 ліпеня

НАЗВА РАБОТ	Калгасы Выканана %	Аднаасобнікі Выканана %
Паўторная полка гародаў	875 га 87	544 га 84
Акучана бульбы і карняплодаў	Уся плошча па два разы	
Скошана сенажаці	11354 га 72	6615 га 53
» канюшыны	2325 » 100	1784 » 100
Убрана сена ўсіх відаў з плошчы	12532 » 91	7003 » 84
Таксама ў тонах	18348 » —	10447 » —
Засіласавана	1114 » 10,6	— » —

Ільготы сялянам, якія ўступаюць у калгасы да ўборкі ўраджаю

Усім раённым і гарадзкім фінансавым аддзелам

Па большасьці раёнаў БССР акладныя лісты па сельгаспадатку і страхоўцы ўжо ўручаны платнікам, а па астатніх раёнах гэта работа заканчваецца.

Між тым, паводле маючыхся ў НКФ вестак, некаторыя раёны не прадаставілі калгасьнікам па іх неабагуленых даходах установленых для іх законам льгот па сельгаспадатку, асабліва тым калгасьнікам, якія ўступілі ў калгасы ў час, або пасьля вучоту аб'ектаў сельгаспадатку, чым парушылі законадаўства ўраду пра сельгаспадатак.

Выходзячы з гэтага, усім калгасьнікам, што ўступілі ў калгасы ў канцы або пасьля вучоту аб'ектаў, абагуліўшы маёмасьць у такой меры, як гэта патрабуецца статутам калгасу і дырэктывамі НКЗему і Калгасцэнтру, а падатак ім быў вылічан як аднаасобнікам, на аснове законадаўства па сельгаспадатку, катэгарычна прапаную:

1. Выключыць з абкладаньня ўсе абагуленыя даходы.

2. Выключыць з абкладаньня неаграмаджаную жывёлу.

3. Выключыць з абкладаньня даходы ад продажу прадуктаў на прыватным рынку па падвышаных цэнах.

4. Прадаставіць льготы за чырвонаармейцаў і інш. асоб, што пералічаны ў арт. 62 палажэньня пра сельгаспадатак.

5. Прадаставіць льготы за пасевы лёну і канапель.

6. Цалкам вызваліць ад абкладаньня неабагуленыя даходы тых калгасьнікаў, у якіх адзін або некалькі членаў сям'і закантрактаваліся на работу ў дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацыях.

7. На неаграмаджаныя даходы калгасьнікаў налічыць падатак па паніжанай шкале ставак, зьмешчанай у арт. 25 палажэньня пра сельгаспадатакк.

Гэтыя льготы павінны быць безадкладна прадастаўлены ўсім калгасьнікам, якія ўступяць у калгасы да ўборкі ўраджаю.

Народны Камісар Фінансаў БССР А. Хацкевіч.

Ударна зьняць ураджай — ВЫГНАЦЬ ПАДКУЛАКАЎ З СЕЛЬСАВЕТАЎ, КАЛГАСАЎ

Ялагінскі сельсавет мае буйных прарываў. Уборачная панія ў самым разгары, а сельсавет ня ведае і ня цікавіцца становішчам уборкі ў калгасах, саўгасах і асабістых гаспадарках. Калгас **Капачова** застаецца без усялякага нагляду, трактары прывезены ў дрэннае становішча з-за шкоднага кіраўніцтва. Калгас пасаджана густа, адсадкі праз гэта ніяк не ідуць, гуркоў ня было, бо гародніна **Баранаўскага** разбазарыў застаўшаяся сенъне. Група падкулачнікаў, што прабраліся ў калгас (**Баранаў, Баранаў брат**) выступаюць супроць зьвядзельшчыны. Быў выпадак, калі Баранаў спрабаваў пабіць брыгадзіра. **Баранаў Яшка, Баранаў Сашка** і **Баранаў Гаўрыла** увесь час сымулююць і ідуць на работу толькі ў калгасу. **У калгасе маецца мясцамі 50 га лугу. Сіласаваньне ударам. Пабудаваная яма, якая прыгодзіцца для сіласаваньня, больш чым на дзесяць метраў.** Трэба сказаць, што ні **парт'ячэйка, ні сельсавет на гэты калгас належнай увагі не зьвярнулі.**

Вялікія прарывы маюцца і ў калгасе **«Барацьбіт»** гэтага-ж сельсавету. Калгас супакоіўся на тым, што пабудаваў адну сілосную яму і на гэтым лей гэтага не пайшоў. Ня лепш становішча з сіласаваньнем і ў калгасе **«Чырвоная армія»**. Сіласаваньне тут таксама зрываецца. Пляна даньне выканана на... 3 проц. Нават шмат непраполатай гароднінай. «Праца» старшыні сельсавету ў калгасе заключаецца ў тым, што ходзіць у калгас абедаць. Старшыня сельсавету **Мінін** няздольны прымаць працай.

Патрэбна зараз-жа, не адкладваючы ніводнай хвіліны, узяцца за ліквідацыю прарываў. Ударнымі тэмпамі калгасьнікі павінны ўбраць балышавіцкі ўраджай.

Брыгада «Віцебскага Пралет

Ударны дзень калгасу

18 ліпеня ў калгасе імя Ватава быў абвешчан ударніка, на які калгасьнікі адзін выйшлі на працу, 10 гадзін было скошана 15 га сенажаці, што магчымасьць да 25 ліпеня сьцю усю працу па ўборцы сена. Калгас перайшоў зьдзельшчыну і кожны калгасьнік атрымаў працоўную кн

Калгасьнікі калгасу імя Ватава абвяшчаюць сябе ударнікамі на ўвесь час правядзеньня ўборачнай і восеннай палітнай кампаніі і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсе калгасьнікі калгасу.

Клімовіч.

Шчыра дзякуем

Праўленьне калгасу «Чырвонай арміі прыносіць шчырую падзяку камандванню байцом Н і Н палкоў за аказаную дапамогу ў праполцы кампаніі на гародніх вучастках калгасу, дзе працавала а палку 75 байцоў і Н—, якія паказалі добрыя прыклады працы.

Мы спадзяёмся, што і у далейшым у неабходны момант байцы заўсёды акажуць нам сваю дапамогу.

Старшыня калгасу Ісае

ПАЗЫКА „3-га РАШАЮЧАГА"

БРАЦЬ ПРЫКЛАД З ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ, ПЕРАВЫКАНАЎШЫХ ЗАДАНЬНІ

Шырэй разгарнуць сацспаборніцтва паміж калгасамі на лепшую падпіску

Максымальна скарыстаць апошнія дні

Ударны дэкаднік рэалізацыі пазыкі на вёсцы падыходзіць к канцу. Некаторыя сельсаветы і калгасы падцягнуліся і нават перавыканалі кантрольныя заданьні па пазыцы (калгас „Капачова" заданьне перавыканаў на 40,5 проц., падцягваецца і Ялагінскі сельсавет—94 проц.). Усё-ж у асноўным, калі рэалізацыя сярод калгасьнікаў ідзе больш-менш здавальняюча і падае поўную ўлэўненасьць у выкананьні кантрольнага заданьня, падпіска сярод аднаасобнікаў ідзе вельмі марудна з прычыны таго, што сярод іх сельсаветы, камісіі садзейнічаньня, партыйныя ячэйкі калгасаў, самі калгасьнікі і асабліва камсамольскія ячэйкі не праводзяць належнай растлумачальнай працы. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва па падпісцы на пазыку не разгорнута.

У застаўшыяся да 1-га жніўня лічаныя дні трэба мабілізаваць усе сілы на поўны ахоп калгасьнікаў і аднаасобнікаў падпіскай на пазыку, шырока разгарнуўшы мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва і ўзяўшы на буксір адстаючыя калгасы, сельсаветы і аднаасобнікаў.

На некаторых прадпрыемствах у горадзе маецца зацішша ў справе рэалізацыі пазыкі («Прафінтэрн», „Прагрэс"). Асабліва дрэнна абстаіць справа з рэалізацыяй пазыкі на заводзе «Чырвоны мэталіст». Неабходна ва што-б та ні стала дабіцца ў бліжэйшыя 2—3 дні поўнага ахопу ўсіх рабочых і працоўных падпіскай і ня менш месячнага заработку.

Безадказнасьць, самацёк і ачкаўціральства зрываюць падпіску ў Сялюцкім сельсавеце

Сялюцкі сельсавет распачаў працу па рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» з вялікім спазьненьнем—8-га ліпеня, але-ж на пасяджаньні сельсавету была высунута сустрэчная лічба ў 24.790 руб. пры заданьні ў 18,115 р. Сустрэчная лічба была разьмеркавана паміж асобнымі калгасамі і залюднёнымі пунктамі. Былі прымацаваны ўпаўнаважаныя з актывістых і праведзена адпаведная работа. Першыя сходы калгасьнікаў паказалі ўзьняўшуюся актыўнасьць калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Падпіска ў асобных выпадках даходзіла да 80 руб. на двор пры заданьні 25 р. Убачыўшы тое, што рэалізацыя атрымала некаторы зрух, кіраўнікі Сялюцкага сельсавету ў асобе **Чагадаева, Новікава і Андрэева** зусім супакоіліся. Атрымалася галавакружэньне ад посьпехаў, а ў выніку—самацёк. Вылучаныя контрагэнты не вялі належнай працы, а такія, як **Рагозіна і Маліноўскі зусім не працавалі**, кажучы, што «сялянства не бярэ пазыку» і г. д. Сельсаветчыкі і селькамсод ня прынялі захадаў да праверкі контрагэнтаў. Мы маем такое становішча, калі член сельсавету калгасьнік **Путанаў** і інш. перавыканалі заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

Трэба адзначыць, што сельсавет і селькамсод падышлі да справы рэалізацыі пазыкі нядбайна. Шырокая растлумачальная праца была заменена самацёкам. Вызначаная сума па рэалізацыі пазыкі выканана толькі на 8,1 проц. Селькамсод ня змог узварушыць грамадзкай думкі вакол тых, якім было вызначана цьвёрдае заданьне па пазыцы. Ясна, што праяўленая мяккацеласьць з боку камсоду характарызуе да некаторай ступені яго палітычную нядольнасьць.

Камсамольская ячэйка дагэтуль стаіць з боку ад рэалізацыі пазыкі. Яна ня ўжыла належных захадаў да выкананьня пастановы ЦК ЛКСМБ аб ахопе ўсіх камсамольцаў пазыкай.

Побач з усёй нядбайнасьцю і безадказнасьцю з боку сельсавету і селькамсоду ў справе рэалізацыі пазыкі, эпошнія заняліся ачкаўціральствам. 21-га ліпеня ў дзяржбанк паступіла адносіна ад Сялюцкага сельсавету за подпісамі старшыні сельсавету т. **Новікава**, сакратара парт'ячэйкі **Андрэева** і **брыгадзіраў гаркому партыі Бабарыка і Конюхава** аб тым, што рэалізацыя пазыкі па калгасах на 20 ліпеня складае **10.301 руб.** Калі-ж была праведзена на месцы праверка, дык аказалася, што падпіска па калгасах складае **6.390 р.**, а ўсяго па сельсавету пазыка рэалізавана на **9800 руб.**

Вызначанае кантрольнае заданьне ў суме 24.790 руб. зусім рэальнае і яно павінна быць выканана да 1-га жніўня.

Гаркому КСМ неабходна прыняць удзел у рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Гарком партыі і гаркамсод павінны прыняць усе захады да хутчэйшай рэалізацыі пазыкі на вёсцы, а сялюцкім апартуністым даць па заслугах.

Камлянкоў.

Камсод працуе марудна

Пытаньне рэалізацыі пазыкі шырока папулярызавалася сярод калгасьнікаў калгасу „Чырвоны мурашнік", **Бараўлянскага** сельсавету. На агульным сходзе вынесьлі пастанову аб падпісцы кожным калгасьнікам на 25 руб. У асноўным усе калгасьнікі выканалі гэтую пастанову, за выключэньнем **Гуркова Якуба**, які падпісаўся толькі на 10 р. Плян заданьня выканан толькі на 76 проц. Тэмпы працы камсоду марудныя. Трэба падцягнуцца.

Пятрусь Бядуля.

Шляхам сацспаборніцтва

На агульным сходзе калгасу „Капачова", Ялагінскага сельсавету, па пытаньні аб паездцы „Трэці рашаючы год пяцігодкі" разгарнуліся ажыўлёныя спрэчкі. Калгасьнікі, улічваючы вялікае значэньне пазыкі, палічылі на неабходнасьць 100 % ахопу ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў і ня менш трохдзённага заработку.

Даклад і спрэчкі аб значэньні пазыкі выклікалі вялікі энтузіязм усіх калгасьнікаў і тут-жа пачалася падпіска, а таксама дадатковая падпіска на пазыку. Калгасьніца **Петрачэнка Волька** дадаткова падпісалася на 25 р. і выклікала ўсіх камсамольцаў і служачых. Камсамольцы **Канстантынаў і Баранаў** дадаткова падпісаліся на 30 р. кожны. **Петрачэнка Паўла** падпісаўся на 150 проц. свайго заработку, а таксама ім і астатнія служачыя. Такім чынам калгасьнікі павялічылі сваю падпіску на 500 р. і перавыканалі план рэалізацыі пазыкі на 40,5 проц., замест 1000 р. падпісаліся на 1.405 р. Гэта лічба бязумоўна будзе яшчэ павялічвацца. Астатнія калгасы павінны ўзяць прыклад з калгасу „Капачова".

Брыгада: **Мілаева і Ліўшыц**

Аб ударніцтве ў друку

...ацыя ўсесаюзнай нарады пры „Правде", да якой далучыўся II усебеларускі зьезд рабсельваенкораў

...ялістычнае наступленьне ...ронце, агульны ўздым гас... ...палітычнай актыўнасьці мас, ...яўся ў сацыялістычным спа... і ўдарніцтве мільёнаў, знай... адбітак у рабселькораўскім ...гледзячы на спробы з бо... Бухарына на IV усесаюзнай ...раўскай нарадзе навязаць ...туністы чную ўстаноўкі, раб... ...ускі рух бурна рос коль... ...касна, павысілася арганіза... ...роля друку, як барацьбіта ...авіцкія тэмпы сацыялістыч... ...аўніцтва, як барацьбіта за ...ную лінію партыі. Асабліва ...выявілася, побач з ростам ..., фабрычна заводзкага і кал... ...ру, у разгортваньні ма... ...ўдарніцкага руху ў друку, ...вядучай форме рабселько... ...руху і ўдзеле мас у друку, ...ых брыгадах, якія зарадзілі... ...бліва шырока разгарнуліся ...О «Правды».

...рнікі як агульнага, так і нізо... ...водзкага, калгаснага і г. д.) ...разглядаюць свой удзел у ...іцкім друку, як працяг сваёй ...работы на вытворчасьці, як ...ваёй барацьбы за генэраль... ...ю партыі, за бальшавіцкія ...ацыялістычнага будаўніцтва ...дах, фабрыках, калгасах. На... ...значае, што работа ўдарнымі ...мі ўздымае рабселькораўскі ...вышэйшую ступень, уздымае ...твам рэдакцый нашых газэт ...брыгады да пастаноўкі ...пова-палітычных і гаспадар... ...станьняў, актуальных на кож... ...ным адрэзку часу.

...ныя брыгады друку зьяўляюц... ...эй з форм ажыцьцяўленьня ...ю найшырэйшымі пралетар... ...асамі над работай дзяржапа... канкрэтнай барацьбы з бю... ...ымам, коснасьцю, праваапар... ...ычнай практыкай і «левымі» ...і.

...ныя брыгады ствараюць ка... ...ныя карэспандэнцыі, што за... ...ывае найбольш правільны па... ...да ацэнкі самых складаных ...аў нашага гаспадарча пат... ...а жыцьця, усебаковае і глы... ...вывучэньне працэсаў сацыя... ...нага будаўніцтва. Дзякуючы ...што ўдарнікі друку зьяўляюц... ...рнікамі бальшавіцкіх тэмпаў ...ытворчасьці, да... ...ая вялікая апэрацыйнасьць га... ...а матарыялу.

...дарныя брыгады, як гэта па... ...двухгадовы вопыт існаваньня ...ых брыгад «Правды» і раду ...газэт, апэрацыйна ўдзельнічаюць ...розных формах масавай работы ...уку («рэйдах», «налётах», па... ...г. д., якія праводзяцца на ...ых вучастках сацыялістычнага ...ніцтва), зьяўляецца адной з ...падрыхтоўкі ў адносна кароткія ...міны кадраў гаспадарчых, ...эсыянальных, савецкіх і парт... ...ых работнікаў, а таксама журна... ...аў з асяродзьдзя рабселькораў. ...іва вялікае значэньне мае ўдар... ...х у друку, як форма падрых... ...пралетарскіх кадраў з карэн... ...насельніцтва ў саюзных аўтано... ...рэспубліках і абласьцях і ў ...нальных раёнах.

Удзел ударных брыгад ва ўсёй ...ай рабоце друку па праверцы ...ваньня дырэктыў партыі ў роз... ...галінах нашага сацыялістычна... ...даўніцтва, вывучэньне работы ...парату і кіраваньня рознымі га... ...ці сацыялістычнай гаспадаркі, ...ўвае ўдарнікаў друку, як актыў... ...памочнікаў і ўдзельнікаў рабо... ...кая праводзіцца органамі рабо... ...лянскай інспэкцыі і ўрадавымі ...ісіямі выкананьня.

Двухгадовы вопыт існаваньня ...ных брыгад пры ЦО «Правде» ...ам і поўнасьцю апраўдаў сябе і ...аў, што вядучай формай рабкораўскага руху на данным этапе ...рнутага сацыялістычнага на... ...ленья на ўсім фронце, стано... ...а ўдарныя брыгады. Нягледзячы ...эта, роля ўдарных брыгад не... ...ньшалася. Асобныя журналісты ...алі простае супрацілень ае разь... ...цю ўдарных брыгад друку.

Ставячы задачу ўсямернага разгортваньня ўдарніцкага руху, нарада заклікае работнікаў друку і рабселькораў да рашучай барацьбы з супраціўленьнем і праваапартыстычнай недаацэнкай з боку асобных груп работнікаў друку справы разгортваньня ўдарных брыгад, ўцягненьне праз гэту форму рабселькораўскага руху найшырэйшых мас пралетараў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў у актыўны ўдзел у бальшавіцкім друку. Разам з тым, нарада падкрэсьлівае, што перабудова масавай работы друку на рэйкі ўдарніцтва ні ў якім разе не павінна прывесьці да ігнараваньня рабселькора-адзіночкі, да проціпастаўленьня яму ўдарнай брыгады. Ігнараванье рабселькора-адзіночкі пры тым становішчы, калі сотні тысячы рабочых у індывідуальным рабкораўстве знаходзяць шлях выяўленьня сваёй грамадзкай актыўнасьці і для разгортваньня самакрытыкі для барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца нічым іншым, як праяўленьнем «левых» загібаў у рабселькораўскім руху. Задачы друку ў адносінах да індывідуала-рабселькора заключаюцца ў тым, каб уцягваць рабселькора-адзіночку ва ўдарныя брыгады.

6. У практыцы некаторых газэт (цэнтральных, абласных і нізавых) скажаюцца асноўныя прынцыпы ўдарнага руху як у арганізацыі, так і ў выкарыстаньні створаных імі ўдарных брыгад. Трэба павесьці рашучую барацьбу са скажэньнямі, якія ў асноўным зводзяцца да наступнага:

А. Бюракратычнае скажэньне самой ідэі ўдарніцтва ў друку, што мае месца ў фактах нератварэньня ўдарнікаў у «падстаўныя» фігуры, за якімі дзейнічае адзін журналіст і г. д.

Б. Дзяляцкі, «спажывецкі» падыход да скарыстаньня ўдарных брыгад вы ключна як «пастаўшчыкоў» матар'ялу, арэпартажваньне (ў горшым сэнсе гэтага слова) ўдарных брыгад пры адсутнасьці выхаваўчай палітычнай работы з ўдарнікамі.

В. У ігнараваньні ўнутрызаводскай работы ўдарных брыгад (ўнутрызаводзкіх «рэйдаў») і г. д.

Г. Наглядаюцца выпадкі падмены ўдарнымі брыгадамі і «пастамі» на прадпрыемствах адзіначальля, некаторая павярхоўнасьць у ацэнцы фактаў, адпабаковая тэндэнцыя выкрываць, „біць", ня фіксуючы ў той жа час сваю ўвагу на дадатных фактах і зьявах, якія ёсьць на ўсіх вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

7. Ударныя брыгады па-новаму ставяць пытаньне аб формах і мэтадах уцягненьня ў рабселькораўскі рух новых соцен, тысяч і мільёнаў пралетараў, высоўваючы асноўнай формай уцягненьне рабочых да ўдзелу ў друку шырокую арганізацыйна - масавую работу газэт на заводах, у калгасах мабілізацыю мас для ўдзелу ў друку на пасобных канкрэтных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва. Вопыт «Правды» паказвае, што толькі актыўная палітычная масавая работа па вярбоўцы рабочых ва ўдарныя брыгады, а не апартыстычная надзея на «самацёк», забясьпечвае бурны рост арміі рабселькораў— ударнікаў. Адной з цэнтральных задач друку зьяўляецца разгортваньне ўдарнага руху ў саюзных і аўтаномных рэспубліках і абласьцях, уцягненьне ва ўдарны рух соцен тысяч пралетараў калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—адпаасобнікаў. Апошніх праз ударныя брыгады накіроўваць на шлях калгасаў.

У тых прадпрыемствах, дзе працуюць кампактныя масы замежных рабочых і, у прыватнасьці там, дзе выдаюцца газэты або старонкі на іншых мовах, трэба ўцягнуць ва ўдарныя брыгады лепшых, праверапых і блізкіх нам замежных рабочых.

Нарада зварочвае ўвагу ўсяго друку на неабходчасьць рашучай барацьбы з наглядкамі засьмечаньня ўдарных брыгад сацыяльна-чужымі, палітычна варожымі партыі элемэнтамі.

8. Ва ўмовах барацьбы за ліквідацыю кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі, разгортваньне ўдарных селькораўскіх брыгад у вёсцы ўзмацняе ў параўнаньні з сельскам адзіночкай пазыцыі селькораўскай арміі ў вёсцы, як арміі перадавых байцоў і памочнікаў партыі ў правядзеньні генэральнай лініі. Нарада ставіць перад усім друкам, у прыватнасьці перад калгасным і саўгасным, пытаньне аб пераходзе на ўдарныя мэтады работы і ўцягненьні ў сваю работу шырокіх мас калгасьнікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў.

Агульны фабрычна-заводзкі друк і рабочыя ўдарныя брыгады, якія групуюцца вакол яго, павінны ў парадку шэфства дапамагчы селькораўскай арміі. калгаснаму і саўгаснаму друку перабудаваць свае формы і мэтады масавай работы па-новаму і перадаць ім свой вопыт.

9. Палітычны рост мас ударнікаў друку будзе забясьпечаны толькі ў тым выпадку, калі партарганізацыі і друк перш за ўсё наладзяць шырокую палітычна-выхаваўчую работу з ударнікамі. Работа друку і партарганізацый у справе палітычнага і арганізацыйнага кіраўніцтва ўдарнікамі друку павінна ісьці па лініі:

а) дакладнага і падрабязнага інструктажу ўдарных брыгад у кожным паасобным выпадку перад адпраўленьнем іх у «рэйд». Практыка «Правды» паказвае, што необходна прыцягваць для інструктажу спэцыялістаў тэй галіны гаспадаркі, для праверкі якое адпраўляюцца ўдарныя брыгады;

б) удзелу адказных літаратурных работнікаў рэдакцыі ў справе палітычнага выхаваньня ўдарнікаў;

в) скліканьня для палітычнага інструктажу, для азнаёмленьня з важнейшымі пастановамі нашай партыі агульна-заводзкіх, цэхавых, міжзаводзкіх і агульна-гарадзкіх (раённых) зьлётаў ўдарнікаў, зьлётаў ўдарнікаў асобных прафэсій і г. д. На гэтых-жа зьлётах трэба абагульняць практыку работы, дзяліцца формамі і мэтадамі работы па-ўдарнаму.

10. Нарада, улічваючы вопыт двугадовай работы ўдарных брыгад друку, адзначае, што з усіх форм работы ўдарных брыгад больш за ўсё апраўдаліся «рэйды», як найлепшая форма ўзьдзейнасьці ўдарнікаў друку на розныя вучасткі сацыялістычнай гаспадаркі.

11. Кожны ўдарнік агульнага (цэнтральнага, абластнога, раённага) друку павінен прымаць самы актыўны ўдзел у рабоце нізавога друку таго прадпрыемства, дзе ён працуе, прымаць удзел у тэй барацьбе, якую ён видзе за адзінства партыі, за ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў. На заводах, у цэхах усе ўдарнікі друку, у рабоце якой-бы газэты яны-б ня ўдзельнічалі, групуюцца вакол рэдкалегій нізавых (цэхавай, заводзкай, калгаснай і гэтак далей) газэт.

12. Аргмасавую работу сярод ударных брыгад (вярбоўку, арганізацыю «рэйдаў» і інш) неабходна будаваць прыстасавальна да задач паасобных галін народнае гаспадаркі (вярбоўка паасобных катэгорый рабочых і калгасьнікаў, арганізацыя брыгад у складзе паасобных прафэсій рабочых, спэцыялізацыя «рэйдаў» і інструктажу ўдарнікаў і г. д.).

Нарада зварочвае ўвагу ўсіх рэдакцый газэт на недапушчальнасць адрыву ўдарнікаў друку ад работы на вытворчасьці і на аснове вопыту «Правды» лічыць неабходным весьці работу з ударнымі брыгадамі ў вольны ад вытворчасьці час.

Нарада лічыць, што перабудова масавай работы друку на рэйкі ўдарніцтва забясьпечыць бурны рост рабселькораўскага руху, дапаможа друку вырашыць важнейшыя задачы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва і завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэ'м, рашаючым годзе пяцігодкі, яшчэ больш наблізіць мільённую армію рабселькораў да нашай камуністычнай партыі, як адданых байцоў за генэральную лінію партыі.

АБ КІРАЎНІЦТВЕ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎСКІМ РУХАМ

РЭЗАЛЮЦЫЯ ЎСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЫ ПРЫ «ПРАВДЗЕ», ДА ЯКОЙ ДАЛУЧЫЎСЯ II УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ

I.

1. XVI зьезд партыі зазначыў, што «гіганцкія посьпехі партыі ў справе будаўніцтва сацыялізму ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы сталі магчымы толькі на базе вялізарнай актыўнасьці рабочае класы і ідучых за ёю працоўных мас, што выявілася ў шырокім разьвіцьці сярод рабочых сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў распачатай перабудове работы ўсіх органаў пралетарскай дыктатуры, партыйных прафэсыянальных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі краіны, за перамогу труднасьцяй, за паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці і саветаў да калгаснага будаўніцтва» (З рэзалюцыі зьезду па справаздачы ЦК УсеКП(б)).

Адлюстроўваючы гэты вялізарны ўздым актыўнасьці мас, рабселькораўскі рух за пэрыяд, што прайшоў пасьля 4-й усесаюзнай нарады, перажыў і перажывае паласу бурнага ўздыму і садзейнасьці мас рабселькораў. Рады рабселькораў павялічыліся з 500 тысяч у 1928 годзе да 2 млн. і больш чалавеку 1930 годзе. Павялічалася колькасьць насьценных газэт у горадзе і ў вёсцы (з 60 000 у 1928 г. да 200.000 —у 1930 г.). Імкліва расьце сетка заводзкіх друкаваных газэт (з 200 у 1928 годзе да 1.000 і больш—у 1930 годзе). Павялічылася ўдзельная вага цэхавага друку (штодзённыя цэхаўкі, бюлетэні, вучастковыя газэты і г. д.). Вырас раённы друк, а таксама калгасны і саўгасны нізавы шматтыражны друк (друкаваныя газэты, шклографічныя шматтыражкі, палявыя і паходныя газэты і інш.). Разьвіваецца нізавы радыё-друк, разгортваецца магутны ўдарніцкі рух у друку. Нізавыя газэты адыгрываюць значную ролю ў барацьбе за прамфінплян, за разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Гэтыя посьпехі дасягнуты пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) у барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе з апартуністы чнымі ўстаноўкамі, якія спрабаваў навязаць руху на 4-й усесаюзнай нарадзе рабселькораў т. Бухарын (і інш.), які разьвіваў перад рабселькорамі свае апартуністычныя погляды на асноўныя задачы будаўніцтва сацыялізму ў рэканструкцыйны пэрыяд.

Гэтыя посьпехі дасягнуты наперакор спробам тав. Бухарына і інш. на гэтай нарадзе дэзарыентаваць рабселькораў сваімі апартуністычнымі ўстаноўкамі аб прычынах класавай барацьбы, прыроды бюракратызму, аб тэмпах індустрыялізацыі саўгаснага і калгаснага будаўніцтва і г. д. Наперакор спробам змазаць палітычныя задачы рабселькораўскага руху і абмежаваць задачы рабселькораў голым «культурніцтвам», роляй інфарматараў, пасыўных адлюстравальнікаў настрою і г. д.—рух рос, як грамадзка-палітычная сіла. Наперакор спробам змазаць перад рабселькорамі задачы барацьбы на два фронты, рабселькоры, пад кіраўніцтвам партыі дапамагаюць апошняй змагацца з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на данным этапе, «левым» апартуністамі і прымірэнцтвам.

2. Усесаюзная нарада падкрэсьлівае, што значныя пласты рабкораў і селькораў выраслі ў **арганізатараў** мас для перамогі труднасьцяй і сацыялістычнага наступленьня.

Рабкор—ударнік і арганізатар ударнікаў, становіцца цэнтральнай фігурай рабкораўскага руху ў адпаведнасьці з тым становішчам, што рабочы - ударнік стаў цэнтральнай фігурай на вытворчасьці. Селькор—калгасьнік, ударнік і арганізатар калгаснага руху становіцца цэнтральнай фігурай селькораўскага руху, што мільёны калгасьнікаў сталі асноўнай і галоўнай апорай савецкае ўлады на вёсцы.

Новы ўздым працоўнага парыву сярод мас рабселькораў, які разгарнуўся ў кампанію падрыхтоўкі да ўсесаюзнай нарады, блізкуча нацьвярджае ўстаноўку сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб вытворчым энтузіязьме пралетараў і калгасьнікаў і бязьлітасна выкрывае правых і «левых» апартуністаў і двурушнікаў з права-«левацкага» блёку, якія ня верацъ у сілы мас, што гіганцкі ўзрасьлі ў сувязі з тым сусьветна-гістарычным фактам, што «мы ўступілі ў пэрыяд сацыялізму» (Сталін).

II.

3. Перад рабселькораўскім рухам эпохі разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце стаяць наступныя задачы:

а) Выхоўваць і арганізоўваць рабкораў і селькораў у актыўных праваднікоў генэральнай лініі партыі як у іх рабоце на вытворчасьці, так і ў друку, у непрымірымых барацьбіто ў праяўленьнямі поглядаў і спраў правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх.

б) Шырока разьвіваць у сваіх радох ударніцкі калгасны рух. Рашуча ажыцьцяўляць лёзунг: «Кожны рабселькор—ударнік і калгасьнік». Арыентуючыся на арганізуючую сілу асабістага прыкладу рабселькораў, дапамагаць партыйным, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям дабівацца максымальных рэзультатаў у справе выкананьня і перавыкананьня прадпрыемствамі дзяржпрамысловасьці, саўгасамі і калгасамі іх вытворчых плянаў.

в) Дабівацца **найвышэйшай арганізаванасьці і дысцыпліны, рашучага паляпшэньня якасьці работы ўсіх зьвяньняў дзяржаўнага, гаспадарчага, каапэрацыйнага апаратаў, рашучага ўмацаваньня ў гаспадарчае разьвіцьцё пляновага пачатку і пляновай дысцыпліны, далейшага росту антыўнасьці працоўнага ўздыму найшырэйшых мас працоўных (сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчны прамфінплян)». (З рэзалюцыі сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).**

У адпаведнасьці з гэтым усямерна разьвіваць у радох рабселькораў інтарэс да рацыяналізатарскай работы і вынаходніцкага руху. Уцягваць рабселькораў у аўладаньне тэхнікай свайго прадпрыемства і ў тэхнічную вучобу, а таксама весьці праз кіруючы і нізавы друк барацьбу за пашырэньне тэхнічных ведаў. Заахвочваць рознастайныя формы ўдзелу і ініцыятывы рабселькораў у справе арганізацыі вышэйшых форм сацспаборніцтва. Разьвіваць арганізацыю рознастайных масавых форм работы рабселькораў у справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, барацьбы за якасныя паказьнікі прамфінплану, правядзеньне рэжыму эканоміі, барацьбы з бюракратызмам і шкодніцтвам, рвацтвам, прагуламі, «лятунамі» і інш. Зьвяртаць асаблівую ўвагу на пасьлядоўнае правядзеньне гаспадарчага разьліку.

г) Побач з працягваньнем барацьбы праз друк супроць усіх недахопаў у рабоце па сацыялістычным будаўніцтве, супроць бюракратычных, права і «лева»-апартуністычных скажэньняў, на практыцы лініі партыі прымірэнчых адносін да гэтых скажэньняў, шкодніцтва і спроб класавага ворага сарваць сацыялістычнае наступленьне—шырока разгортваць на старонках друку (кіруючага і нізавога) паказ перамог і дасягненьняў сацыялізму ў нашай краіне і абмен вытворчым вопытам.

Разгортваць паказ пераваг сацыялістычнай гаспадаркі на старонках зарубежнага рабочага друку шляхам максымальнага ўзмацненьня міжнароднай сувязі рабселькораў, уцягваючы ў гэту сувязь свае заводзкія, саўгасныя і калгасныя калектывы.

д) Дапамагаць партыйным арганізацыям і органам ЦКК—РСІ, а таксама мясцовым камісіям выкананьня ажыцьцяўляць важнейшую справу праверкі выкананьня партыйных і ўрадавых дырэктыў. Арганізоўваць рабкораў і селькораў у дзейных памочнікаў партыі для **«праверкі людзей і праверкі фактычнага выкананьня справы»** (Ленін).

е) У карэспандэнцкай рабоце рабселькораў узмацніць элемэнты свячасовага папярэджаньня праз друк аб **рашаючых** недахопах будаўніцтва, дапамагаць друку глыбей пранікаць **у сутнасьць** эканамічных зьяў. Цясьней і непасрэдней зьвязваць друк з прадпрыемствамі і асноўнымі масамі рабочых і калгасьнікаў. Уцягваць у работу друку рабочых і работніц і, у прыватнасьці, кадравых рабочых, інжынэрна-тэхнічных работнікаў, замежных рабочых і г. д.

ж) Арганізоўваць масу рабселькораў, як актыўных праваднікоў нацыянальнай палітыкі партыі, арганізатараў мас на барацьбу з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі і мясцовага нацыянальнага шавінізму і з прымірэнцтвам да іх.

з) Уцягваць рабселькораў у работу па ўмацаваньні абароназдольнасьці СССР і ўзмацненьні магутнасьці Чырвонай арміі.

і) Рашуча пакончыць з рэшткамі гурткоўшчыны, якія яшчэ захаваліся, і неарганізаванасьці радоў рабселькораў, неабходна перабудаваць рабселькораўскія арганізацыі пад кутом забесьпячэньня іх пасьпяховай барацьбы за вырашэньне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі. У аснове перабудовы праводзіць нязьменна лёзунгі: тварам да вытворчасьці і аўладаньня тэхнікай сваёй вытворчасьці.

к) Спрыяць павышэньню палітычнага ўзроўню і газэтнай кваліфікацыі рабселькораў, уцягваючы іх у сетку парт. і палітасьветы, гурткоў, школ, курсаў, завочнага навучаньня і г. д.

л) Рашуча змагацца са спробамі клясавага ворага скарыстаць друк і рабселькораўскі рух у сваіх інтарэсах, разгортваючы максымальную рэвалюцыйную пільнасьць і бязьлітасна выкідаючы клясава - варожыя элемэнты з радоў рабселькораў.

4. Для таго, каб ажыцьцявіць паказаныя вышэй задачы, рабкоры і селькоры павінны рашуча перабудаваць усе формы і мэтады сваёй дзейнасьці пад кутом выкананьня імі канкрэтных задач тых галін народнае гаспадаркі, у якіх працуюць данныя рабселькоры. У адпаведнасьці з асаблівасьцямі тых ці іншых галін сацыялістычнай гаспадаркі павінны спэцыялізаваць сваю работу рабселькоры: вугальнай прамысловасьці, мэталюргіі, чыгуначнага і воднага транспарту, машынабудаўнічай прамысловасьці, новабудоў, саўгасаў і калгасаў—збожжавых, жывёлагадоўчых, тэхнічных культур і г. д.

«Барацьба за выкананьне прамфінпляну і грамадзкі кантроль за работай цэхаў і брыгад павінны быць асноўнымі ў нізавым друку (цэхавым і брыгадным). У гэтым-жа напрамку праводзіць усю арганізацыйна выхаваўчую работу з рабкорамі» (з пастановы ЦК УсеКП(б) аб партыйнай і масавай рабоце ў цэху і брыгадзе). У адпаведнасьці з гэтым неабходна перабудоўваць нізавы друк, умацоўваючы і разьвіваючы газэты ў зьменах, групах, брыгадах, зьвеньях і інш., ствараючы зьменныя, агрэгатныя, брыгадныя рэдкалегіі, пасты і г. д.

III.

5. Канстатуючы недастатковасьць кіраўніцтва рабселькораўскім рухам з боку партарганізацый, нарада лічыць неабходным:

а) Сканцэнтраваць у данны момант пільную ўвагу і намаганьні **на праверцы выкананьня** нізавымі партарганізацыямі дырэктыў аб партыкіраўніцтве рабселькораўскім рухам і нізавым друкам, якія ня раз даваліся партыйнымі зьездамі і ЦК партыі. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на дырэктывы аб уключэньні ў плян работы партарганізацый пытаньняў нізавога друку і рабселькораўскага руху.

б) Разгортваць бязьлітасную барацьбу з недаацэнкай нізавога (і ў прыватнасьці, цэхавага і радыё) друку, як адной з форм праяўленьня апартунізму на практыцы, забясьпечыўшы на справе ўзмацненьне **непасрэдней адказнасьці мясцовых партарганізацый** за стан нізавога друку і рабселькораўскіх арганізацый.

в) Партарганізацыям забясьпечыць максымальную чуласьць да здейнасьці рабселькораў з боку прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый праўленьняў калгасаў, саветаў. Гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі павінны ўзначаліць вытворча-грамадзкую актыўнасьць і ініцыятыву мас рабселькораў (надкапляючы іх прапановы, праводзячы іх у жыцьцё, дапамагаючы ім тэхнічнай нарадай і кансультацыяй, заахвочваючы і прэміюючы лепшых рабселькораў-ударнікаў і г. д.).

З прычыны павышэньня палітычнай ролі і адказнасьці задач шматтыражнага друку, набыўшага вялізнае значэньне ў пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы, необходна лічыць друкаваныя, шматтыражныя і радыё-газэты на прадпрыемствах «органамі парткамітэтаў (**бюро парт'ячэек, бюро ячэек камсамольскіх арганізацый**) і фабзаўмясцкомаў. Друкаваныя, шматтыражныя газэты ў вёсцы **лічыць «органамі бюро парт'ячэек і сельсаветаў» (камсамольскіх ячэек)**. Насьценныя газэты як у горадзе, так і вёсцы захоўваюць ранейшую назву (газэты рабочых і служачых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў такой і такой вёскі і г. д.). Трэба праводзіць далей рашучую барацьбу з маючымі яшчэ месца часта фактамі бюракратызму, апекі, цэнзуры і інш. скажэньняў партлініі ў адносінах рабселькораўскіх арганізацый і нізавога друку, як праяўленьнямі права і «лева» апартуністычных адносін да правядзеньня лёзунгаў партыі аб разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі.

д) Падкрэсьліваючы, што сельскія (калгасныя) партарганізацыі нясуць **непасрэдную адказнасьць** за стан нізавога друку і рабселькораўскіх арганізацый, нарада лічыць, што ў выпадках адсутнасьці ў калгасе, вёсцы парт'ячэек, непасрэднае кіраўніцтва селькораўскімі арганізацыямі і газэтамі там павінна быць ускладзена на раённыя камітэты партыі, якія павінны ажыцьцяўляць гэта кіраўніцтва як непасрэдна, так і праз раённыя газэты, камуністаў і камсамольцаў, якія працуюць на мясцох.

е) Узмацніць пасылку партарганізацыямі падрыхтаваных партыйных кадраў на кіруючую работу ў нізавым друку, асабліва—фабрычна-заводзкіх, саўгасных, калгасных друкаваных, шматтыражных і радыё газэтах. Вылучаць кадры партработнікаў для правядзеньня палітычна-выхаваўчай работы сярод ударнікаў друку, а таксама для пастаноўкі адзделаў партжыцьця ў заводзкіх, калгасных і саўгасных газэтах.

ж) Неабходна павярнуць у дапамогу нізавому друку работу агітатараў-прапагандыстаў, сакратароў кадраў, партгабінэтаў партыйных арганізацый. Інструктары абкомаў і райкомаў, якія праводзяць абсьледваньне работы нізавых партарганізацый, павінны ўключаць у кола сваіх абсьледваньняў праверку стану партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам.

6. Усесаюзная нарада адзначае наяўнасьць адставаньня кіраўніцтва рэдакцый газэт ад гіганцка ўзросшай актыўнасьці мас рабселькораў. Найбольш характэрнымі праяўленьнямі гэтага адставаньня кіраўніцтва зьяўляюцца:

а) Многімі газэтамі невыстарчальна рашуча ажыцьцяўляецца лёзунг: «Кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор». Газэты часта не ўзначальваюць актыўнасьць мас рабселькораў-ударнікаў і калгасьнікаў, пакідаючы іх без арганізацыйнага і ідэйнага кіраўніцтва, гэтым самым аб'ектыўна зьніжаючы размах масавай ініцыятывы і творчасьці рабселькораў-ударнікаў.

б) Дзяляцкія, яўна-апартуністычныя адносіны некаторых газэт да рабселькораў. Практыка вузка-«спажывец «пастаўшчыкоў» газэтнага матар'ялу, як толькі да інфарматараў, адлюстроўваюць праваапартуністычныя погляды тав. Бухарына і інш. на рабселькора. Практыка вузка-«спажывецкага» падыходу да рабселькораўскага руху і яго вядучага зьвяна—ударнага руху друку—прыводзіць часта да поўнага скажэньня ідэй ударніцтва ў друку, замазваньня на справе актыўна-арганізатарскіх функцый ударных брыгад і ператварэньня іх выключна ў «наглядальныя», «дваровыя» пасты, падмены паглыбленай масавай работы знадворнай парадняцьцю і г. д.

7. Неабходна разгортваць і ўсямерна ўмацоўваць заклік ударнікаў і калгасьнікаў у друк. У рабоце рэдакцый газэт з рабселькорамі неабходна рашуча стаць на чале таго новага, што характарызуе рабселькораўскі рух на новым этапе—ударныя брыгады друку, іх вытворча-арганізатарскую ролю, іх ролю перадавых атрадаў вытворцаў.

8. Ажыцьцяўленьне на справе перабудовы кіраўніцтва друкам масамі пад лёзунгам «тварам да вытворчасьці», ставіць задачу пакончыць з традыцыямі кіраўніцтва „наогул" і пераходу да мэтадаў канкрэтнага кіраўніцтва рабселькорамі на глебе ўцягненьня іх у ажыцьцяўленьне чарговых палітычных і гаспадарчых задач. «Задачы, якія стаяць перад рабселькорамі, трэба канкрэтызаваць у залежнасьці ад тэй галіны народнае гаспадаркі, у якой працуе данны атрад рабселькораў» (з прамовы тав. Постышава на Усесаюзнай нарадзе). У сувязі з гэтым неабходна:

а) Сыстэматычна арганізоўваць рабселькораў для вырашэньня прак друк гаспадарча-палітычных задач на канкрэтных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва (вугаль, мэталь, транспарт, бавоўна, лён, нафта, руда; калгасны прыліў, ліквідацыя кулацтва, як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі, арганізацыя працы ў калгасах, барацьба за сустрэчны прамфінплян, за якасныя паказальнікі, за гаспадарчы разрахунак і г. д.).

б) Уцягваць нізавы друк адпаведных галін гаспадаркі ў правядзенье важнейшых масавых палітыка-гаспадарчых кампаній кіруючага друку, устанаўляючы пры іх правядзеньні «адзіны фронт» кіруючага і нізавога друку, сканцэнтроўваючы на данным вучастку сілы ўсіх зьвяньняў друку—ад цэнтральнай і абласной, да раённай і цэхавай газэты.

в) Весьці ў кіруючых газэтах сыстэматычныя агляды нізавога друку, прыраўноўваючы іх па значэньні да перадавых артыкулаў, ажыцьцяўляючы праз гэтыя агляды канкрэтнае кіраўніцтва рабселькорамі і нізавымі газэтамі, даючы ў аглядах указаньні дапасавальна да спэцыфічных задач гэтых газэт. Пераходзіць ад ранейшага тыпу выставак газэт, якія адлюстроўвалі звычайна знадворны выгляд апошніх, да арганізацыі тэматычных агляднych выставак (выстаўкі газэт аднародных прадпрыемстваў і цэхаў, галін прамысловасьці і сельскай гаспадаркі і г. д.).

9. Ва ўсёй аграмасавай рабоце сярод рабселькораў сурова ўлічваць іх выцворчыя і прафсыяльныя інтарэсы і задачы вытворча-тэхнічнага выхаваньня (скліканье нарад і зьлётаў рабселькораў паасобных галін прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, адпародных прадпрыемстваў, цэхаў, работа з рабселькорамі паасобных прафэсій і зьмен, адпаведны інструктаж рэдкалегій, пастаноўка дакладаў, канфэрэнцыі і г. д.).

10. Палітыка - выхаваўчая работа сярод рабселькораў павінна быць максымальна ўзмоцнена.

Работа ўдарных брыгад друку павінна дапамагаць рабселькорам-ударнікам палітычна ўсьведамляць і абагульваць тую суму матар'ялаў, пытаньняў, задач, якія яны вырашаюць у сваёй практычнай рабоце.

11. Ліквідацыя акруговых газэт ставіць вобласны друк тварам да раёну, у сувязі з чым апошні абавязан так перабудаваць сваё кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, каб ад адказнасьці «наогул» абавязкова перайсьці да канкрэтнай адказнасьці перад парткамітэтамі за стан рабселькораўскай работы і нізавога друку ў раёнах. Замест масавых аддзелаў устанавіць у газэтных і радыё-цэнтрах **аддзел рабселькораў і ўдарных брыгад** для канкрэтнага кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі, рабселькорамі-адзіночкамі і нізавым друкам у раёнах, аддзелы гэтыя павінны абрасьці шырокім актывам добраахвотнасьці інструктараў і райарганізатараў з асяродзьдзя лепшых рэдактараў заводзкіх газэт, работнікаў партарганізацый, спэцыяльнымі рабселькораўскімі калегіямі і г. д.

12. Раённыя газэты становяцца непасрэднымі арганізатарамі руху. Выкананьне гэтай задачы нямысьліма бяз самага шырокага прыцягненьня да гэтай работы актыву з лепшых і перадавых рабселькораў-ударнікаў і калгасьнікаў і без арганізацыі апорна-узорных пунктаў работы. Там, дзе ёсьць магчымасьць, арганізаваць пры раённых і гарадзкіх газэтах аддзелы рабселькораў і ўдарных брыгад.

13. Цэнтральныя газэты павінны быць непасрэдна прыцягнуты да дапамогі рабселькорам і нізавому друку. Неабходна спэцыялізаваць кіраўніцтва нізавым друкам у адпаведнасьці з тымі спэцыфічнымі задачамі і пытаньнямі, якія ўваходзяць у кола даннай цэнтральнай газэты. У задачы цэнтральных газэт павінна ўвайсьці друкаваньне сыстэматычных агляданў нізавога друку, агляданў кіраўніцтва ім з боку адпаведных вобласных і раённых газэт, скліканье пэрыядычных нарад-курсаў, паасобных груп рабселькораў і рэдактараў нізавых газэт, выпуск бюлетэняў для арыентаваньня нізавога друку.

14. Павінна быць забясьпечана асаблівая ўвага да нізавога нацыянальнага друку.

Неабходна рашуча трымаць курс на выданье нізавых газэт на нацыянальных мовах (нац. газэт, нац. старонкі, куткі і г. д.), прасякаючы ўсякія спробы прынізіць значэньне разгортваньня нізавога нац. друку і падрыхтоўку кадраў, як праяўленьне на практыцы вялікадзяржаўнага ўхілу. У той жа час трэба бязьлітасна змагацца са спробамі нацыяналістычных элемэнтаў, выкарыстаць нац. друк і рабселькораўскі рух у інтарэсах варожай пралетарыяту нацыянал-шавіністычнай палітыкі.

Перабудова работы каапэрацыі павінна стаць справай усіх працоўных

Ігнаруючых дырэктывы партыі аб перабудове каапэрацыі—да адказнасьці

Жнівень—ударны месячнік ліквідацыі чаргі

усім райпрафсаветам, аб'яднаньням, ЦРК, ЗРК і райспажыўсаюзам

Канстатуючы, што за апошні гада ў складзе ня менш 3-х часз боку ЦРК, ЗРК і райспалавек. Штабу ў двухдзённы тэрсаюзаў не вядзецца адпа- мін распрацаваць каляндарны веньня

Па-баявому падрыхтавацца і правесьці міжнародны чырвоны дзень

У абставінах баявой рэвалюцыйнай актыўнасьці міжнароднага пралетарыяту і нарастаньня бальшавіцкіх тэмпаў у выкананьні пляну трэцяга рашаючага году сацыялістычнай пяцігодкі мы праводзім у трэці раз міжнародны чырвоны дзень 1-га жніўня. Гэты дзень павінен быць галоўнай палітычнай кампаніяй МОПР'у і ўсіх працоўных.

Неабходна зараз-жа падрыхтавацца і скарыстаць увесь вопыт і ініцыятыву ячэек МОПР'у і на падставе дырэктыў--пляну гаркому, дасланага ячэйкам МОПР 16-га ліпеня, правесьці гэтую кампанію па-ўдарнаму. Неабходна шырока асьвятляць сучаснае міжнароднае становішча, капіталістычна-эканамічны крызіс, нарастаньне рэвалюцыйнай хвалі, шалёны белы тэрор у капіталістычных краінах, посьпехі сацбудаўніцтва, узмацненьне базы сусьветнай рэвалюцыі—СССР, задачы пралетарыяту ў справе барацьбы з падрыхтоўкай узброенага нападу на СССР бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету.

1-га жніўня пралетарыят усяго сьвету будзе дэманстраваць сваю салідарнасьць у справе барацьбы супроць бойкі, пажарышч і сьмерці і сваю гатоўнасьць ператварыць імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую, будзе дэманстраваць сваю гатоўнасьць да абароны сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны—СССР ад нападу імпэрыялістых.

Мопраўцы і ўсе працоўныя ў мэтах дапамогі барацьбітом рэвалюцыі ў гэты дзень павінны прыняць усе захады для ўзмацненьня работы МОПР'у.

Галоўныя задачы МОПР'у да дню 1-га жніўня наступныя:

Пашырэньне радоў МОПР'у, дамагаючыся 100 проц. ахопу членствам усіх працоўных, сваячасовы зьбор членскіх узносаў, канчатковая ліквідацыя запазычанасьці па гэтых узносах і за літаратуру.

Да гэтага дню ячэйкі МОПР'у павінны паглыбіць і пашырыць сталую работу па інтэрнацыянальным выхаваньні і растлумачэньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

К 1-му жніўня МОПР павінен яшчэ больш уцягнуць сваіх членаў ва ўдарную работу па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну трэцяга рашаючага і па ўдзелу ўсіх сваіх членаў у чарговых палітычна-гаспадарчых кампаніях.

Усе мопраўцы-ударнікі, усе ўдарнікі—у рады МОПР'у. Вось лёзунг, які павінен быць выканан.

У міжнародны чырвоны дзень мы павінны шырока павесьці растлумачальную работу аб значэньні кампаніі і зборы сродкаў на пабудову інтэрнацыянальнага дзіцячага дому і на зімовую кампанію дапамогі, якая пачынаецца з 19-га жніўня, дамагаючыся перавыкананьня заданьняў гаркому МОПР.

Лёзунгі, дыяграмы, плякаты МОПР'у павінны быць ва ўсіх куткох гораду і вёскі і на дэманстрацыях у дзень 1-га жніўня.

Усю працу падрыхтоўкі да 1-га жніўня ячэйкі МОПР павінны правадзіць разам з прафарганізацыямі і Асоавіяхімам, пад кіраўніцтвам партарганізацыі.

Мінлін.

Чакаем неадкладнага адказу

АД ФАНЭРШЧЫКАЎ, ЛЕСАПІЛЬШЧЫКАЎ І ЎСІХ, ХТО ЗАТРЫМЛІВАЕ ДАПАМОГУ РАЗЬВІЦЬЦЮ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АВІАЦЫІ

Лесазавод і фанэрны ў дэкаднік яшчэ не ўключыліся

Зноў прыходзіцца адзначыць, што сыгналы друку аб недаацэнцы партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі лесазаводу, фанэрнага і інш. разьвіцьця грамадзянскага паветранага флёту не пачуты і арганізацыі гэтых прадпрыемстваў, як і раней, з-за сваёй апартуністычнай недаацэнкі дэкадніка і простага ігнараваньня пастановы гаркому і гарсавету аб уключэньні ў дэкаднік,—не заставрылі гэтае пытаньне сярод рабочых, у выніку чаго рабочыя гэтых прадпрыемстваў ніякага ўдзелу ў дэкадніку ня прымаюць.

За ігнараваньне пастановы аб дэкадніку бюро партячэек лесазаводу і фанэрнага трэба прыцягнуць да адказнасьці. Неабходна партыйным і прафсаюзным арганізацыям усіх прадпрыемстваў разгарнуць растлумачальную працу вакол дэкадніка і прыняць усе захады да пасьпяховага яго правядзеньня, раўняючыся па рабочых заводу „Чырвоны мэталіст“, якія адлічылі аднадзённы заробак у карысьць разьвіцьця грамадзянскага паветранага флёту.

Нічога ня зроблена

Фабрыка Лекерта, ня гледзячы на тое, што дэкаднік дапамогі грамадзянскай авіацыі набліжаецца к канцу, у гэтай галіне яшчэ нічога не зрабіла. Пытаньне аб дэкадніку ня ставілася ні на адным рабочым сходзе. Парткалектыў і цэхавыя ячэйкі, калектыў камсамолу і цэхавыя камсамольскія ячэйкі нічога не зрабілі.

Трэба гаркому партыі прыцягнуць да адказнасьці партыйны калектыў фабрыкі Лекерта за ігнараваньне і недаацэнку пастановы гаркому партыі аб правядзеньні дэкадніка дапамогі грамадзянскай авіацыі.

Э. Я.

Адказваем мэтпромаўцам

На сходзе партактыву акулярнай фабрыкі была заслухана інфармацыя аб дапамозе грамадзянскаму паветранаму флёту. Сход прыняў выклік рабочых заводу «Чырвоны мэталіст» і пастанавіў аддічыць аднадзённы заробак у карысьць пабудовы ангару пры грамадзянскай школе лётнікаў імя т. Варашылава. Зараз гэта пастанова пераносіцца ва ўсе цэхі і зьмены.

Праводзім збор сродкаў

3 і раён стралковай аховы 26-га ліцея правёў суботнік, сродкі ад якога цалком перададзены на пабудову эскадрыллі імя Леніна. Апрача таго, ва ўзводах праводзіцца зараз збор сродкаў па падпісных лістох. Напрыклад: **2-гі ўзвод** за адзін дзень **сабраў 150 руб.** Стралок т. **Жучкоў** ўнёс 10 руб. і выклікаў увесь камандна-палітычны і стралковы склад раёну. Многа таварышоў ўнесьлі па 5 руб.

На 27-е ліпеня зноў прызначан суботнік, у якім прымуць удзел астатнія стралкі і камандзіры. Наш лёзунг—«Ніводнага стралка і камандзіра, ня ўдзельнічаючага ў суботніку дапамогі грамадзянскай авіацыі» будзе выканан так, як выканан лёзунг у адносінах Варашылаўскага суботніка.

Нінанаў.

У фонд імя т. Трыандафілава

Увесь ганарар за заметкі, зьмешчаныя ў «Віцебскім Пралетарыі» за першую палову 1931 г. перадаю ў фонд імя тав. Трыандафілава.

Е. Гласко.

Аўтагаспадарка камтрэсту патрабуе гаспадарчага вока

13-га ліпеня на плошчы Волі загарэўся матор аўтабусу. Прыбыўшай пажарнай камандай машына была адратавана, але гэты выпадак настойліва патрабуе зьвярнуць увагу адпаведных органаў на становішча аўтагаспадаркі камтрэсту, бо, ня гледзячы на рад паказаньняў, дадзеных аўтадорам, пасьля абсьледваньня спэцыяльнай брыгадай, на цэлы рад артыкулаў у газэце, камтрэст упарта не жадае лічыцца з голасам грамадзкасьці і друку. Аўтобусы утрымліваюцца брудна (што і спрыяла ўспламяненьню матора), няма агнятушыцеля, і калі-б такі пажар здарыўся за горадам, ад машыны нічога не засталося-б. У двары камтрэсту адкрыта хаваецца бэнзін у колькасьці 5 бочак без усялякага нагляду. Камтрэст у пагоні за рублём, замест абслугоўваньня рабочых, часта возіць спэкулянтаў з прадуктамі ў Лёзна і псуе машыны на дрэннай дарозе, прычым кожны раз на гэтыя дарогі пасылаюцца новыя машыны і ламаюцца па чарзе.

Трэба пакласьці гэтым брыдкасьцям канец. Слова за РСІ.

Кліно.

Акулярная вядзе ўкамплектаваньне штату з ліку рабочых чыгункі

Пастанова партыі і ўраду аб рашучым пераломе ў аздараўленьні транспарту знайшла практычнае праламленьне ў жыцьці віцебскага вузла. За апошні час мы маем значныя посьпехі ў ліквідацыі прарыву на транспарце. Поўнасьцю ліквідавана «абязьлічка» сярод паравозных брыгад, усе брыгады пераведзены на спараную язду. Спачатку пераходу на спараную язду мелася шмат дэфектаў з боку самих працуючых, якія не ўсьвядомілі важнасьці гэтага пытаньня і неакуратна зьяўляліся на працу ў паказаныя гадзіны.

Але і зараз маюцца няяўкі на працу некаторых таварышоў (**Жураўлёў Бавыль сыстэматычна не зьяўляўся, а зараз ужо працуе на акулярнай фабрыцы**). З 25-га чэрвеня па 5-е ліпеня мелася 37 выпадкаў няяўкі, што складае ў сярэднім 1,8 проц. да агульнай колькасьці рабочых, з 5-га па 15-е ліпеня 31 няяўка, ці 1,5 проц. Тлумачыцца гэта часткова тым, што з пераходам на спараную язду рабілася ўкамплектаваньне штату без усякага падбору, каб толькі замацаваць за паравозамі брыгады. Дрэнны падыход да ўкамплектаваньня брыгад і даў у першыя часы адмоўныя вынікі.

У апошнія дні маюцца выпадкі, што некаторыя не зьяўляюцца на працу а устрайваюцца на акулярную фабрыку. Адміністрацыя акулярнай фабрыкі вядзе ўкамплектаваньне за кошт чыгуначнікаў, не жадае разумець, што гэтым яна падрывае працу чыгункі. Неабходна павесьці рашучую барацьбу з цякучасьцю, для чаго ўсе прадпрыемствы не павінны прымаць на работу ніводнага рабочага бяз згоды адміністрацыі таго прадпрыемства, з якога пераходзіць рабочы, бо інакш мы ня зможам весьці барацьбу з цякучасьцю.

Х—м.

Пленум сэкцыі гарсавету

Сёньня, а 7 гадз. увечары, адбудуцца пленумы сэкцый гарсавету:

Вайсковай—у Ялагінскім сельсавеце, зьбор на вуглу Бальнічнай вуліцы, а 6 гадз.

Адміністрацыйна-прававой— у памяшканьні пракуратуры (Замкавая № 24).

Сельскагаспадарчай—у доме «селяніна».

РСІ—у клюбе швэйнікаў.

Камунальнай—у клюбе камунальнікаў.

Працы і забясьпекі — у клюбе саматужнікаў.

Нарасьветы—у доме асьветы.

Аховы здароўя—у клюбе мэдсан працы.

Бытавой—у клюбе будаўнікоў.

Каапэрацыйна-гандлёвай — у клюбе «Прафінтэрн».

Грашовай—у памяшканьні гарсавету, пакой № 22.

Прамысловай—у клюбе мэталістых.

Напярэдадні 1-га жніўня

ВЕНА. Колькасьць арыштаваных, у зьвязку з 1 жніўня, дасягнула па ўсёй Румыніі некалькіх сот чалавек. Арыштаван рад кіруючых работнікаў прафруху. Паліцыя штодзённа вытварае масавыя ператрускі. Канфіскавана вялікая колькасьць лятучак. Рабочыя кварталы Бухарэсту робяць уражаньне ваеннага лягеру. Грамадзкія будынкі ахоўваюцца атрадамі, якія прымушаюць праходзячых міма рабочых падымаць рукі.

БЭРЛІН, 23. Кіруемая с.-д. паліцыя Бэрліну і ўсёй Прусіі выдала фашысцкай арганізацыі «Стальны шлём» дазвол на правядзеньне дэманстрацыі ў Люстгартэне ў Бэрліне на 2-е жніўня ў той час, як камуністычная антываенная дэманстрацыя 1-га жніўня ў тым-жа Люстгартэне забаронена.

ВАРШАВА. У Лодзі адбылася антываенная камуністычная дэманстрацыя пад лёзунгам „Вайна імпэрыялістычнай вайне“. На адным з пляцаў гораду адбылася сутычка паміж дэманстрантамі і паліцыяй.

У рабочых раёнах Варшавы раскідваюцца камуністычныя лятучкі. У адным з рабочых раёнаў зьбіт агэнт паліцыі, які спрабаваў затрымаць рабочага, які прымацоўваў да правадоў чырвоны сьцяг. Каля турмы „Павіак“ адбылася камуністычная дэманстрацыя, разагнаная конной паліцыяй.

Другі дзень тыражу пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“

Выйгрышы ў 1000 і 200 р.

Тыраж праходзіць пры напружанай увазе працоўных Чалябінску. З бліжэйшых раёнаў прыехалі дэлегаты з рапартамі аб пазыцы. На ранішнім паседжаньні 26 ліпеня разыграна 44.200 выйгрышаў бяспроцантнай пазыкі, пераважна па 200 р. Выйгрышы па 200 р. палі на наступныя аблігацыі: аблігацыя № 8, сэр. 1946; № 9, сэр. 69159; № 3, сэр. 23591; № 9, сэр. 51876.

На вячэрнім паседжаньні тыражнай камісіяй разыграна 62900 выйгрышаў на агульную суму 12.743.200 р.

Па тысячы руб. выйгрышы палі на наступныя аблігацыі: № 8, сэр. 83909; № 6, сэр. 53796; № 5, сэр. 25948; № 2, сэрыя 58592; № 1, сэр. 92689.

Аб забытым трупе аднаго сабакі

«У папа была сабака. Поп яе любіў»...

Магчыма сабака, аб якім ідзе гутарка, быў і не ў папа: пры цяперашніх папоўскіх прыбытках і сабаку трымаць нявыгодна.

Але-ж, што гэтага сабаку любілі і нават цяпер яго труп любяць і камунаддзел і міліцыя і санітарны ўрач—гэта факт. Жыхары Віцебску гэтую любоў добра адчуваюць. Труп сабакі ўжо чатыры дні ляжыць у цэнтры гораду на Валадарскай. Ляжыць, разлагаецца, сьмярдзіць...

Навошта камунаддзел, міліцыя і саннагляд трымаюць так доўга нябожчыка?

Адказы можа быць два: ці гэта асаблівая любоў, ці новая сыстэма санітарнай работы.

Асаблівай прыгожасьці для гэтага сабачы труп не прадстаўляе. Нават ад гніеньня—зусім ня спрыяе лепшаньню санітарнага стану горада.. Такая думка працоўных цэбскіх. Але-ж відавочна, сапраўды іншага погляду.

Магчыма, што там разважаюць так:

-- Нічога, таварышы, пацярпіце крыху, у такую сьпякоту сабаку ня зусім агніе, застануцца толькі косьці і ня трэба будзе дыхаць ручаным паветрам.

❦

Але жарты нам непатрэбны. Хай ведамленьня ад гарсавету, хто вінаваты ў гэтай справе і якое пакараньне на вінаватых накладзе

М. Хованскі.

Нарада членаў бюро скаргаў

31 га ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу гаркому (Замкавая 26), адбудзецца нарада членаў бюро скаргаў з наступнай абвесткай дню:

1. Інфармацыя аб нарадзе прыцы ЦКК (т. Сінякоў).
2. Аб становішчы працы бюро скаргаў.

На гэту нараду павінны зьявіцца члены бюро скаргаў, дабраахвотнікі, «ЛК» і дэлегаткі жанаддзелу.

Члены бюро скаргаў:

Драке, Фёдараў, Кантар, Зархін, Нікалаева, Дэлекторская, Вярхоўскі (**камтрэст**).

Шчарбакоў, Фрышман Г., Лейнерт (завод «**Камінтэрн**»).

Бранзбург, Лубчын, Сандлер, Леўянт (**піўзавод**).

Шаўко Л., Александраў, Скрыпко (**дрожзавод**).

Бер К., Лазарэва А., Кляц Г., Рабкіна Х. (**Белуціль**).

Пашкоўская, Шаўковіч, Буцянаў, Нікалаева (фка «**Дзьвіна**».

Аксельрод, Іофінаў (друкарня «**Камінтэрн**»).

Бабарыкін, Заблоцкі, Баяў, Гасілоўскі, Ізрайліт, Бутырына (ф-ка «**Прагрэс**»).

Яновіч, Эйдэльман, Астроўскі (**гольная** ф-ка).

Сінякоў, Корзін, Панічаў, Бранзбург (**Мэтпром** № 3).

Сьвірскі (**воласапрадзільная** ф-ка).

Фарман, Еўрынсон, Андрыеўскі, Сталярэнка, Кавалёў (**скурзавод**).

Перах (ф-ка **Лекерта**).

Блюмкін (**панчошная** ф-ка).

Каган, Ісхізаў (**шчацінная** ф-ка).

Пахомаў (**шчотачная** ф-ка).

Лебедзеў, Крым, Пятроў Левік, сельгоф, Амосава, Пятухоў, Павік (ф-ка «**Прафінтэрн**» № 1).

Гарнічова (**заразная б-ца**).

Дабраахвотнікі:

Беленьні, Вярхоўскі, Аўсяньнікаў, Багарад Зелік, Філіпоўскі, Берат, Небылаў, Левін, Рыжкін, Карпін (**Мэтпром № 3**).

Борц, Буевіч, Меклер (ф-ка «**Прагрэс**»).

Шэндлер (**піўзавод**).

«Лёгкая кавалерыя», працуючы пры бюро скаргаў РСІ:

Азарх, Гуткін, Фрыдман, Пінкер, Купер, Слуцкая, Зінкевіч, Кальварскі, Гарнастаева, Нікалаева, Эшт, Бараноўская, Міончынскі, Хаціна (**чошная** ф-ка).

Акімаў, Нікіцін, Шальмэйстэр, Асёнак, Сьмелаў, Каваленка, Сьпірадовіч, Гадаскін (**Мэтпром**), Кац (**старш. брыгадзір**).

Дэлегаткі жанаддзелу:

Зайцава, Розенберг, Белкіна, Хаенка (**Інстр.-мэбл.** ф-ка).

Усава, Шашкова, Красавіцкая, Буль, Красноўская (**шчацін.** ф

Ліпсон, Васількова, Вінаград, Малочнікава, Долгіна, Сусед А. (ф-ка **Лекерта**).

Кабішчар, Каган, Ігнаценка, Сініна (**гармылсаюз**).

Петрашкевіч, Будрова, Шпакоўскі, Рабко, Мінава (**МК дом работніц**), Гаравой, Цішкавец, Мурашкін, Мошкін, Красільшчык, Баранок (**ЛК палітэхнікум**).

Бюро скаргаў Р

Пашыраны пленум т-ва „Прэч непісьменнасьць“

Сёньня, 29 ліпеня, а 7 гадз. увечары, у Доме асьветы адбудзецца **пашыраны пленум праўленьня т-ва «Прэч непісьменнасьць»**, разам з дабрахвотнікамі і інструктарамі. Пажадана прысутнасьць сакратароў членаў ячэек «П. Н.». Яўка абавязкова для т. т. **Шамес** (віцэпрэзідэнт **Уварава** (вэтінстытут), **Сальдэвіча, Захарэнка, Гаршкова** (МББ), **Лабэнскага** («Чырвоны мэталіст), **Ліфшыца** («Прафінтэрн»), **Кейф** (панчошная фабрыка), **Лейбава** (лесазавод № 13), **Кобец** («Дзьвіна»), **Скудэльскага** (лесазавод 13), **Маеўскага** (ф-ка Лекерта).

— Сёньня, 29-га ліпеня, а 6 гадз. увеч., у памяшканьні гарсавету (габінэт старшыні гарсавету) склікаецца нарада па пытаньні восеннемовых перавозак.

На нараду павінны зьявіцца 3-кутнікі наступных устаноў: кіраўніцтва раёну МББ чыг., дзяржпараходства, саюзтранс, ЦРК, саюзхлебатара, плодаовашч, упаўнаважаны Наркамснабу, райкалгассаюз, райсаюз і ўсе ЗРК г. Віцебску, з матар'ялам аб падрыхтоўцы да восеннемовых перавозак.

ГарНК—РСІ, гарсавет.

— 31-га ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні гарсавету пакой № 23, адбудзецца нарада галоўных бухгальтараў і адказных работнікаў прадпрыемстваў і устаноў г. Віцебску, сумесна са старшынямі камсодаў.

На парадку дню:

Аб практычным правядзеньні афармленьня падпіскі на пазыку «3-ці рашаючы год».

Кіраўнікі ўстаноў і старшыні ФЗМК абавязаны забясьпечыць яе паказаных асоб.

Гарсавет, гармамсод.

Да ведама ячэек ЛКСМБ

Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ГК ЛКСМБ адбудзецца нарада культпропу ячэек ЛКСМБ. Парадак дню: Аб 17 МЮ. Яўка абавязкова.

ГК ЛКСМ.

Час. вык. аб. рэдактара **Н. Баруноў.**

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Пач. а 8½ гадз. увеч.

АПОШНІЯ 2 ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ТЭАТРУ ДРАМЫ І КАМЭДЫІ

Сёньня, 29-га ліпеня, прадапошні спэктакль

ХТО ІДЗЕ

камэдыя ў 4-х дзеях.

У чацьвер, 30-га ліпеня, апошняя разьвітальная гастроль

БЯЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ

ў 4-х дзеях, Астроўскага.

Біл. прад. у касе тэат. з 12 да 2 гадз. дню і з 5 да 10 гадз. увеч.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ КІНО-ТЭАТР

Толькі 2 дні: сёньня, у сераду, 29-га і заўтра, ў чацьвер, 30-га ліпеня, замежны баявік

Абуджэньне жанчыны

Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. 1036—2—2

ВІЦЕБСКІ ЭЛЕКТРА-ТЭХНІЧНЫ РАБФАК

ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ Ў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ ЭНЭРГЭТЫКІ

абвяшчае **ВОСЕНІНЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ на І курс і на ІІ курс яўрэйскага аддзяленьня.**

Прымаюцца асобы не маладзей 18 год і не старэй 30 год, па сацыяльнаму становішчу: рабочыя, батракі, калгасьнікі з працоўным стажам ня менш 2-х год.

Паступаючыя на IV курс павінны мець стаж 3-гадовы.

На аднолькавых правох з рабочымі прыймаюцца асобы, якія працуюць на прадпрыемствах сувязі (тэлефаністы, тэлеграфістыя і г. д.) ня менш 3-х год.

Служба ў Чырвонай арміі для рабочых, батракоў, калгасьнікаў і работнікаў сувязі залічваецца ў працоўны стаж.

Для асоб, займаючых выбарчыя пасады, працоўны стаж зьніжаецца на 1 год.

Для членаў КП(б)Б працоўны стаж зьніжаецца на 1 год пры наяўнасьці партстажу:

пры ўзросьце ад 18 да 20 год—2 гады,
» » » 21 » 25 » —3 »
» » » 26 » 30 » —4 »

Для членаў УсеЛКСМ—з рабочых, калгасьнікаў, або работнікаў сувязі, працоўны стаж зьніжаецца на 1 год пры наяўнасьці 3-гадавога камсамольскага стажу.

Асобы, якія жадаюць паступіць на рабфак, падаюць заяву ў канцэлярыю рабфаку (Валадарская, 72/17), з наступнымі дакумантамі:

1) Камандыровачнае пасьведчаньне.
2) Спраўку аб працоўным стажы.
3) Мэтрыку.
4) Анкету, завераную камандыруючай арганізацыяй.
5) Копію вайсковага білету (для мужчын).

(Калгасьнікі павінны прадставіць даведку аб сямейным і маёмасным становішчы да ўступленьня ў калгас і аб часе ўступленьня ў калгас).

6) Пасьведчаньне аб адукацыі.
7) Пасьведчаньне аб сацыяльным становішчы бацькоў.
8) Пасьведчаньне, што бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў.

За ўсімі спраўкамі даведацца ў канцэлярыі рабфаку (Валадарская, 72/17), штодзённа ад 10 гадз. раніцы да 3-х гадзін дню і ад 6 да 9 гадз. увеч.

942—5—4 Нам. дырэктара рабфаку (подпіс).

ГАРТЭАТР ДАМЭЦ

Сёньня, у сераду, 29-га, і у чацьвер, 30-га ліпеня,

КАНЦЭРТ

ВЯДОМАГА ВЫКАНАЎЦЫ НАРОДНАЙ ЯЎРЭЙСКАЙ ПЕСЬНІ

М. І. ЭПЕЛЬБАЎМА

БЕЛДЗЯРЖКІНО з панядзелка, 27-га ліпеня

СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 1 дзень: сёньня, 29 ліпеня, амэрыканскі фільм **Лагуна пэрлаў** у 8 частках.

МАСТАЦКІ Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 1 дзень: сёньня, 29 ліпеня, новая замежная камэдыя **ХРЫЗАНТЭМА**

ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 1 дзень: сёньня, 29 ліпеня, **ЗЯЛЕНЫ ЗАВУЛАК**

Вниманию строителей!

Для защиты подвалов от грунтовых вод, фундаментов, стен от сырости, для изоляции цистерн, баков, рекомендуем применять **ЦЕМЕНЗИТ**, делающий водонепроницаемым цементные растворы.

Одна часть цемензита, размешанная с 10 частями воды, дает эмульсию (молоко), которой затворяют сухую смесь цемента и песка. 1 клгр. цемензита достаточно для штукатурного слоя 1—2 кв. метр.

Цена 65 коп. 1 клгр. франко-завод.

Заказы и заявки просим заблаговременно направлять: Харьков, Газетный пер., № 3, Стройпрому.

Проспекты бесплатно.

1041—1—1

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ

абвяшчае

прыём на 1-ы курс вэтінстытуту

на дзённае аддзяленьне ў ліку 90 асоб, вячэрняе—60 асоб, 250 асоб на завочнае навучаньне і на 1-ы курс вэттэхнікуму—102 асобы.

Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку Наркамасьветы на 1930|31 навучальны год.

Прыём заяў для жадаючых паступіць як у вэтінстытут, так і ў вэттэхнікум будзе працягвацца да 15-га жніўня, з якога часу пачынаюцца іспыты для нямаючых належнай адукацыі.

Пачатак заняткаў 1-га верасьня г. г.

Заявы накіроўваць па адрасу: **Віцебск, вэтінстытут.**

Дырэкцыя інстытуту.

1015—3—2

Вячэрні палітэхнікум

абвяшчае прыём заяў на аддзяленьні: мэханічнае, студзёнай апрацоўкі мэталяў, цэпла-тэхнічнае і электра-тэхнічнае.

Лік вакансый: на 1-ы курс—180 чалавек, на 2-гі курс—11 чалавек, на 3-і курс—16 чалавек.

Прымаюцца рабочыя розных саюзаў, працуючыя на мэталёвай, электра-тэхнічнай ці іншай блізкай спэцыяльнасьці, маючыя стаж ня менш 2-х год і скончыўшыя сямігодку ці падрыхтоўчыя курсы. Ня маючыя гэтай адукацыі, павінны трымаць іспыты.

Да заявы прыкладаць дакумэнты: аб сацыяльным становішчы сваім і бацькоў, аб стажы, аб адукацыі і анкету, зацьверджаную прафсаюзнымі ці савецкімі арганізацыямі. Заявы прымаюцца з 20-га ліпеня да 15-е верасьня у канцэлярыі палітэхнікуму, як днём, так і ўвечары.

989—3—2

У сувязі з пераходам БЕЛЭНЭРГА

ў новае памяшканьне, прыём заяў і плата за электраэнэргію будзе вытварацца з 23 га гэтага ліпеня па вул. Калініна, д. № 22/9 (б. Васкрэсенская царква) **з 9 гадз. раніцы да 8 гадз. увеч. штодзённа.**

БЕЛЭНЭРГА.

1014—3—3

КУПЛЮ 4-ВОЛЬТАВЫЯ акумулятары, ёмкасьцю 40 ампер-гадзін (можна і меншай) старыя ці новыя. Прапановы адрасаваць: вул. Чырвонага Міліцыянэра, № 12, Бурко С. 1028—3—2

Друкарні „Камінтэрн“ ПАТРАБУЮЦЦА

для кваліфікацыі на наборшчыкаў

падлеткі ад 18 год, маючыя адукацыю ня ніжэй 6—7 клясаў.

Жадаючыя могуць наведацца ў друкарні: Бальшавіцкая, 10, ад 8 гадз. раніцы да 5 гадз. дню.

Адміністрацыя.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ АДКЛАДАЕЦЦА на 2-га ЖНІЎНЯ

К-т Чырвонага крыжу

1025—3—3

У ноч з 23-га на 24-е ліпеня з саўгасу «Капычова», Ялагінскага с/с, **зьбегла кабыліца** **вараная,** належачая Віцебскаму аддзяленьню Белбудканторы. Просьба ведаючых паведаміць па адрасу: Віцебск, вуліца Талстога, 8, тэл. № 5-69, Белбудканторы.

1048—1—1

Згублены членскі білет саюзу Рабіс № 93678 і квіток транссаюзу на хаваньне рэчаў на імя **Быкавай Н. Ф.,** якія лічыць несапраўднымі. 1045—1—1

Віцгарліт № 1.

Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10.

Тыраж 10.000